ПАМЯЦЬ, ЗАХАВАНАЯ Ў ПАРТЫЗАНСКІХ ГАЗЕТАХ 5

ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў БРУНЕІ? 10

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

6 КРАСАВІКА 2019 г. СУБОТА

№ 65 (28932)

ЗВЯЗДА

АЎТАРЫТЭТ ПРАВАСУДДЗЯ НЕЗАЛЕЖНАЙ КРАІНЫ

Аляксандр Лукашэнка адкрыў будынак Вярхоўнага Суда і правёў нараду па пытаннях судовай дзейнасці

Фота БелТА.

У фае новага будынка кіраўнік дзяржавы перарэзаў сімвалічную чырвоную стужку, пасля чаго перадаў сімвалічны ключ ад будынка старшыні Вярхоўнага Суда Валянціну Сукалу. Для Прэзідэнта правялі невялікую экскурсію: паказалі залу судовых пасяджэнняў і кабінет суддзяў, а таксама залу Пленума Вярхоўнага Суда. Далей пачалася нарада па пытаннях удасканалення дзейнасці сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі.

«Вельмі хацеў бы, каб гэта быў светлы, добры, чысты дом для ўсёй судовай сістэмы», — сказаў кіраўнік дзяржавы аб новым будынку, дадаўшы, што хоча, каб ад гэтага будынка была належная аддача. Новы будынак, па словах Прэзідэнта, пабудаваны з «запасам» — велічныя залы стануць таксама пляцоўкай для мерапрыемстваў праваахоўных органаў. «Я хацеў, каб ён быў падобны да Палаца Незалежнасці, у адным стылі, калі гэта сімвал незалежнасці, каб гэта было беларускае. Усё тут зроблена рукамі беларусаў і з беларускіх матэрыялаў, як у Палацы Незалежнасці», — адзначыў ён.

«Сённяшняя падзея — знакавая не толькі для судовай сістэмы, але і для краіны ў цэлым, — падкрэсліў беларускі лідар. — І справа не толькі ў будынку, хоць ён атрымаўся сучасны, функцыянальны. Ён сімвалізуе аўтарытэт судовай улады. Такі і павінен быць палац правасуддзя». Але і не гэта галоўнае. Пабудова такога будынка кажа пра тое, што Беларусь раз і назаўжды ў свой час узяла курс на суверэнітэт і незалежнасць, сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён выказаў надзею, што гэты будынак стане такім жа сімвалам суверэнітэту як Палац Незалежнасці.

Запыт на сацыяльную справядлівасць

Што да самой нарады, Прэзідэнт адзначыў важнасць таго, што яна праходзіць у пашыраным складзе. Па яго словах, неабходнасць падобнай сустрэчы наспела даўно: з моманту правядзення падобнага мерапрыемства прайшло восем гадоў.

У сваім выступленні Аляксандр Лукашэнка спыніўся на кірунках, якія ідуць «ад жыцця».

Асноўны крытэрый, якім кіруюцца людзі пры ацэнцы работы судоў, — гэта сацыяльная справядлівасць. Прэзідэнт упэўнены, што сацыяльная справядлівасць з'яўляецца не толькі залогам даверу насельніцтва да судоў і правасуддзя, але і найважнейшым складнікам ідэалогіі беларускай дзяржавы. Запыт на гэтую справядлівасць каласальны ва ўсім свеце.

На яго думку, грамадзяне павінны быць упэўнены, што ў судзе знойдуць абарону сваіх правоў і законных інтарэсаў. Гэта значыць, іх праблему пачуюць, паглыбяцца ў жыццёвую сітуацыю. Прымуць аргументаванае і ўзважанае рашэнне. І вельмі важна, каб чалавеку было зразумела, чаму суд вынес менавіта такое рашэнне.

«Людзі, якія прыйшлі ў суд, павінны верыць у яго здольнасць устанавіць ісціну. Тады ім не прыйдзецца ў пошуку праўды звяртацца — ну да каго ж, вядома, пасля суда — зразумела, да Прэзідэнта. Суддзям трэба быць свабоднымі пры прыняцці рашэнняў. Не баяцца пракуроры. Не залежаць ад меркавання следчых. Не азірацца на мясцовую і іншыя ўлады, кіравацца толькі законам», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён звярнуў увагу, што пры гэтым у цэнтры ўвагі суддзяў заўсёды павінен быць чалавек.

«Трэба пераасэнсаваць бачанне сваёй прафесіі. Быць больш уважлівымі да людзей. А часам і ставіць сябе на іх месца. Толькі такі суд будзе па-сапраўднаму аўтарытэтны і справядлівы», — дадаў ён.

Якасцю, не колькасцю

Другой найважнейшай задачай дзейнасці судовай сістэмы Прэзідэнт назваў фарміраванне моцнага кадравага складу. На яго думку, тут многія пытанні ўжо вырашаныя. Стабілізаваная сітуацыя з цякучасцю кадраў. Павысіўся прэстыж прафесіі і прывабнасць працы суддзі, дзяржава забяспечыла годны ўзровень заработнай платы ў параўнанні з іншымі катэгорыямі, ёсць пэўныя магчымасці для яе павышэння.

«Сёння трэба казаць ужо пра якасць судзейскіх кадраў. Іх належная падрыхтоўка і высокі прафесіяналізм — абавязковая ўмова эфектыўнасці дзейнасці судовай улады, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — У першую чаргу трэба прынцыпова мяняць падыход да кандыдатаў на судзейскія пасады. У суд павінны ісці людзі, якія валодаюць нават не высокімі, а найвышэйшымі маральнымі якасцямі, шырокім кругаглядам, эрудыцыяй і жыццёвым вопытам. Гэта аб'ектыўнае патрабаванне сучаснага грамадства».

Што датычыцца ўзроставага цэнзу для суддзяў — тут судзейскай сістэме трэба вызначыцца самастойна, бо рэдка, але ёсць вопытныя, адказныя, мудрыя і падрыхтаваныя людзі, якія і ў 25 гадоў могуць стаць суддзёй. Узяць той жа вопыт — у якім узросце можна яго атрымаць, пытанне вельмі індывідуальнае, упэўнены кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

Фота БелТА.

Па палічках

«ЗЯЛЁНАЯ КАРТКА» — ГАРАНТ НАШАЙ ПЕНСІІ

Зараз у краіне адкрыта каля 7,7 мільёна картак сацыяльнага страхавання

Сярэдняя пенсія па ўзросце ў сакавіку склала 393,51 рубля. Сёлета, па звестках Мінпрацы і сацабароны, плануецца падняць сярэдні памер пенсій да 40 % ад сярэдняй зарплаты па краіне. Аб тым, што ўплывае на памер нашых пенсій і чаму трэба задумвацца аб будучай старасці ўжо сёння, а таксама пра зялёную картку сацыяльнага страхавання, расказвае кіраўнік Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА.

Пенсіі пажылым «плаціць» маладое пакаленне

У нашай краіне дзейнічае салідарная сістэма дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, у аснове якой ляжыць прынцып узаемадапамогі пакаленняў. Яе можна сфармуляваць так: пакуль мы працуем, са сродкаў, што адлічваюцца намі (а дакладней, нашымі работадаўцамі), плацяцца пенсіі цяперашнім пенсіянерам. Калі мы працаваць не зможам, нашы пенсіі будуць фарміравацца з адлічэнняў новага пакалення.

Аднак гэта не азначае, што ў будучыні памер нашых пенсій будзе залежаць толькі ад маладога пакалення работнікаў, адзначае Наталля Паўлючэнка. Паўплывае і наша працоўная актыўнасць. А менавіта такія два фактары, як працягласць працоўнай дзейнасці і памер заробку, з якога адлічваюцца ўнёскі ў бюджэт Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Што датычыцца першага фактару, то для прызначэння працоўнай пенсіі ў 2019 годзе патрабуецца мець 17 гадоў працоўнага стажу з выплатай страхавых узносаў (гэта так званы страхавы стаж) і агульны працоўны стаж: мужчынам — 25 гадоў, жанчынам — 20. Штогод патрабаванні да страхавога стажу павялічваюцца на паўгода і ў 2025-м для прызначэння працоўнай пенсіі трэба будзе мець 20 гадоў страхавога стажу.

СТАР. 2

Інавацыі ў адукацыі

Чаму «буксуе» лічбавая трансфармацыя?

Ці ў сілах педагог канкурыраваць з інтэрнэтам і размаўляць на мове вучняў...

Па даных даследавання ЕС, у найбліжэйшы час лічбавыя навыкі спатрэбяцца на 9 з 10 працоўных месцаў, але 169 мільёнаў еўрапейцаў ва ўзросце ад 16 да 74 гадоў (або 44 % ад агульнай колькасці) не маюць базавых лічбавых навыкаў.

Чаму ў Беларусі «буксуе» лічбавізацыя адукацыі? Якой павінна быць школа ў лічбавую эпоху? Пра што трэба клапаціцца найперш — пра наяўнасць у навучальнай установе інтэрнэту на высокіх хуткасцях або пра гатоўнасць педагогаў працаваць з новымі тэхналогіямі? Якімі лічбавымі кампетэнцыямі павінны валодаць вучні і іх настаўнікі? Пра ўсё гэта разважалі ўдзельнікі II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Лічбавая трансфармацыя адукацыі DTE 2019». Мерапрыемства ўяўляе сабой міжнародную інтэлектуальную пляцоўку для свабоднага абмену ідэямі і вопытам у галіне адукацыі і сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Без даведак і справаздач

— У нашай краіне дзейнічае правіла: нельга пытацца пра штосьці двойчы, — падкрэсліваe **начальнік аддзела электронных паслуг Міністэрства адукацыі і навукі Эстонскай Рэспублікі Андрэс АРЭМАА.** — Гэта значыць, што калі нейкі сектар ужо валодае інфармацыяй, то іншаму сектару запытваць тую ж самую інфармацыю забаронена.

Трэба растлумачыць, што Эстонія лічыцца адной з самых «прасунутых» у лічбавых тэхналогіях краін свету. Яе яшчэ называюць «тэхналагічнай Меккай». У 2000 годзе эстонскі парламент прыняў закон аб прызнанні доступу да інтэрнэту неад'емным правам чалавека. Рэформы па лічбавізацыі ахапілі абсалютна ўсе сферы грамадства: адукацыю, ахову здароўя, падатковую сістэму, рынак працы і іншыя.

— 99 % усіх сэрвісаў даступныя ў нас анлайн. Ёсць толькі тры сэрвісы, якія такім чынам не дзейнічаюць: нельга заключыць, скасаваць шлюб і набыць жыллё анлайн, — кажа Андрэс. — Выкарыстоўваць усе сэрвісы анлайн грамадзянам дапамагае ID-карта, якая ёсць у кожнага. А з дапамогай мабільнага тэлефона мы можам пакінуць свой лічбавы подпіс.

СТАР. 3

ЦЫТАТА ДНЯ



Іван ЛАЎРЫНОВІЧ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці:

«У Гродзенскай вобласці вырашаны практычна ўсе пытанні, якія паступілі ад жыхароў рэгіёна да «Вялікай размовы». У любой сітуацыі трэба станавіцца на бок грамадзяніна, паглядзець на праблему яго вачыма. Зразумела, што не ўсе пытанні можна зняць імгненна, для вырашэння некаторых патрэбны час, аднак і ў такім выпадку зацягванне на працяглы тэрмін недапушчальнае. Неабходна аргументавана і зразумела тлумачыць людзям прычыны таго ці іншага рашэння, інфармаваць, калі ў рамках закона або з-за эканамічнай неэфектыўнасці зрабіць штосьці ў інтарэсах заяўніка не ўяўляецца магчымым».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Ілан Маск страціў больш як мільярд долараў за дзве хвіліны

Мільярдэр Ілан Маск страціў 1,1 мільярда долараў за дзве хвіліны пасля адкрыцця таргоў у Нью-Ёрку. Пра гэта паведамляе Bloomberg.

Акцыі яго кампаніі Tesla Inc. абрынуліся на 11 працэнтаў. Гульцы на біржы адрэагавалі такім чынам на навіны пра рэкордныя скарачэнні паставак электрамабіляў да 63 тысяч у першым квартале 2019 года з 90 тысяч у чацвёртым квартале мінулага года. Гэта падзенне акцый скараціла багацце Маска да 22,3 мільярда долараў.

19 лютага Маск размясціў твіт аб планах выпусціць паўмільёна электракараў у 2019 годзе. Камісія па каштоўных паперах (SEC) ЗША палічыла, што гэтае паведамленне можа паўплываць на паводзіны інвестараў. У выніку акцыі кампаніі ўпалі на 5,4 працэнта.

У верасні 2018 года SEC узбудзіла супраць Ілана Маска крымінальную справу. Нагадай стаў твіт аб намеры зрабіць кампанію прыватнай і выкупіць усе акцыі па 420 долараў. Заяўлены кошт быў вышэй за рынкавы, а Маск пасля адмовіўся ад сваіх планаў. Гэта стала падставай западозрыць яго ў махлярстве з мэтай паўплываць на курс акцый. У выніку ён пакінуў пасаду старшыні савета дырэктараў.

ААН заклікала да будаўніцтва гарадоў, якія плаваюць

Плаваючыя гарады дазволяць чалавецтву пазбегнуць глабальнага затаплення ў выніку змены клімату, заявіла намеснік Генеральнага сакратара ААН Аміна Махамед, выступаючы на мерапрыемстве па тэме дасягнення мэт устойлівага развіцця.

Па звестках ААН, амаль 60 % гарадоў з насельніцтвам больш як 300 тысяч чалавек маюць высокую рызыку пацярпець ад цыклонаў, засух, паводак, землятрусаў і вывяржэнняў вулканаў. Прычым у некаторых рэгіёнах такое ўжо адбываецца. «У выніку кліматычных змяненняў павялічваецца рызыка затаплення гарадоў. Паводле некаторых звестак, Бангкок кожны год падтапляецца на два сантыметры, і ўзровень вады ў Сіямскім заліве працягвае падымацца», — канстатавала прадстаўнік сусветнай арганізацыі.

Яна заклікала «будаваць для людзей, а не для аўтамабіляў, будаваць гарады, якія не апынуцца пад вадой у выніку ўздыму ўзроўню мора». «Словам, гарады павінны стаяць на вадзе, а не пад вадой», — сказала Аміна Махамед.

Трамп лічыць, што ЗША, Кітай і Расія маглі б разам скараціць выдаткі на абарону



Прэзідэнт Дональд Трамп лічыць, што ЗША, Кітай і Расія маглі б дамовіцца аб скарачэнні выдаткаў на абарону і патраціць гэтыя сродкі на нешта іншае.

«ЗША, Кітай і Расія, усе мы ўкладваем мільярды долараў у зброю, уключаючы ядзерную. Я думаю, што ў гэтым няма ніякага сэнсу», — сказаў кіраўнік Белага дома падчас сустрэчы з віцэ-прэм'ерам Дзяржсавета КНР Лю Хэ. «Тры краіны могуць разам сабрацца і спыніць гэтыя траты, пускаць іх на нешта больш прадуктыўнае для дасягнення доўгатэрміновага міру», — адзначыў ён.

Па словах Трампа, дыялог аб скарачэнні выдаткаў на вытворчасць узбраенняў «можа стаць другім этапам» пасля заключэння гандлёвага пагаднення з Кітаем.

«Лічу, што гэта вельмі добрая ідэя», — сказаў віцэ-прэм'ер Дзяржсавета КНР Лю Хэ ў адказ на заяву кіраўніка Белага дома. Трамп падкрэсліў, што зараз няма ніякіх тэрмінаў для магчымага пачатку такога дыялогу.

КАРАТКА

- **У Віцебскай вобласці на час пасяўной кампаніі ў дапамогу аграрыям дадаткова прыцягнута 1,5 тысячы чалавек.**
- Захваральнасць на ВРІ і грып у Гомелі за апошнія 10 гадоў знізілася больш чым на 22 %.
- **Міністэрства аховы здароўя прапрацоўвае пытанне правядзення бясплатнай спробы ЭКА для шлюбных пар ва ўзросце да 40 гадоў.**

- Філіп Кіркораў сёння будзе адным з гасцей шоу «Макаёнка, 9» на канале Беларусь 1.
- **Магілёвец з 2013 года ўзяў у доўг у некалькіх чалавек больш як Br160 тыс., але вяртаць не збіраўся. Ён затрыманы, заведзена крымінальная справа.**

КАРАЦЬ НЕЛЬГА ДАПАМАГАЦЬ

Нам неабходна сістэма суправаджэння сем'яў з асаблівасцямі

У нашай краіне ў цэлым нядрэнна выбудавана сістэма падтрымкі неўладкаваных сем'яў з дзецьмі. Калі размова ідзе пра залежных бацькоў. Але ёсць іншая катэгорыя сем'яў. Яны вельмі розныя, але маюць дзве агульныя рысы: бацькі ў іх не злоўжываюць алкаголем, але ім пастаўлены той або іншы... дыягназ.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Сям'я М. стварылася 15 гадоў таму. «Я Наташу адразу палюбіў, — прызнаецца Аляксандр. — Пажаніліся, і жонка зацяжарала двайнятамі. У нас нарадзіліся два сыны».

Роды ў Наталлі былі цяжкімі... Хлопцы з'явіліся на свет неданошанымі. Праблемы пачаліся амаль адразу. Дзеці хварэлі і часта плакалі.

«Нягледзячы на тое, што нам дапамагала бабуля Наталлі, у якой мы жылі, — я памятаю, што мы ўсе не высыпаліся. Досведу ў выхаванні здаровых дзяцей у нас не было, не тое што хворых. Нам было вельмі цяжка», — успамінае Аляксандр. Яшчэ ў радзільні маладых бацькоў папярэджвалі, што з Кірылам і Сашам (так назвалі двайнят) будуць цяжкасці.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

Блізкая ўлада

ТРЭБА БЫЦЬ УЗАЕМНА КАРЭКТНЫМІ

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ЖАЎНЯК правёў прыём грамадзян у Сянне

Мясцовым уладам трэба быць паважлівымі да людзей і даступна тлумачыць матывацыю таго ці іншага рашэння, тады і пытанняў у грамадзян будзе менш. Такое меркаванне падчас выязнога прыёму грамадзян у Сенненскім райвыканкаме выказаў журналістам намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Жаўняк.

Фота БелТА.

«Такія прыёмы важныя для абмену думкамі і разумення, што адбываецца ў райвыканкамах. Бо часам грамадзяне, прыходзячы да ўладаў на мясцовым узроўні, атрымліваюць некарэктныя адказы, што і нараджае звароты людзей у вышэйстаячыя інстанцыі. Уладам трэба ўважліва выслухоўваць людзей і разбірацца ў іх праблемах», — адзначыў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Сёння на прыём да Уладзіміра Жаўняка прыйшла жыхарка Бешанковіч, якая раней звярталася па дапамогу ў працаўладкаванні да мясцовых уладаў. Маладая маці, якая выхоўвае дзіця адна, шукае работу са студзеня. Была вакансія ў адной з арганізацый раёна, жанчына падыходзіла па патрабаваннях, але кіраўнік арганізацыі адмовіў у працаўладкаванні, спаслаўшыся, што ён яе не ведае. «Такое стаўленне да людзей недапушчальнае. Чалавек падыходзіць, а яго з надуманых прычын не бяруць. Так, часам і грамадзяне займаюць пазіцыю, калі ім прапануюць некалькі вакансій, але людзі з тых ці іншых прычын не згаджаюцца. Трэба быць узаемна карэктнымі і ў вырашэнні пытання зыходзіць з сітуацыі, якая склалася», — сказаў Уладзімір Жаўняк.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта дадаў, што ў Віцебскай вобласці вырашаны практычна ўсе пытанні, якія паступілі ад жыхароў рэгіёна падчас «Вялікай размовы». Засталося некалькі, якія патрабуюць дадатковай прапрацоўкі.

На прыём у Сянно многія грамадзяне прыехалі з іншых раёнаў і гарадоў. Людзі звярталіся з пытаннямі па якасці работы міліцыі і следчых, жыллёвымі, медыцынскімі, пенсійнымі праблемамі і іншымі. Па ўсіх дадзены адпаведныя даручэнні.

Паводле БелТА.

ВЫСЛУХАЮЦЬ І ДАПАМОГУЦЬ

Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае ажыццяўляць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах

У ходзе выезду ў рэгіёны прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта правядуць у тым ліку і праверку адказаў дзяржаўных органаў на пытанні, якія жыхары раёнаў накіравалі на БелТА падчас акцыі «Ваша пытанне Прэзідэнту» ў рамках падрыхтоўкі і правядзення «Вялікай размовы з Прэзідэнтам». Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў.

Гэтым разам прыёмы пройдуць у Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай абласцях і ў Мінску па наступным графіку:

памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Віталь ВОЎК правядзе прыём у **Талачынскім райвыканкаме 9 красавіка з 10.00;**

памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ у гэты ж дзень будзе праводзіць прыём у **Чэрвеньскім райвыканкаме з 10.00;**

10 красавіка памочнік Прэзідэнта — інспектар па гораду Мінску Віталь ПРЫМА будзе працаваць з **9.00 у Мінскім гарвыканкаме, а начальнік галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Рыгор ШЛЫК — з 14.00** у **Мазырскім райвыканкаме;**

11 красавіка намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый МІЦКЕВІЧ будзе праводзіць прыём у **Сенненскім раёне з 14.00,** а **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Анатоль МАРКЕВІЧ** прыедзе ў **Камянецкі райвыканкам, дзе з 10.00 да 11.00** правядзе прамую тэлефонную лінію, а **з 11.00** — асабісты прыём. **Ён жа 12 красавіка** накіруецца ў **Бярозаўскі райвыканкам**, дзе таксама **з 10.00 да 11.00** правядзе прамую тэлефонную лінію, а з **11.00** — асабісты прыём. **11 красавіка** ў **Чашніцкім райвыканкаме з 11.00** прыём правядзе **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі — начальнік упраўлення кіруючых кадраў і дзяржаўных узнагарод Генадзь РАШАЦЬКО;**

12 красавіка ў **Карэліцкім райвыканкаме з 14.00** будзе ажыццяўляць выязны прыём **Ігар СЯКРЭТА, начальнік упраўлення знешняй палітыкі.**

ДОБРАЯ МАГЧЫМАСЦЬ ВЫКАЗАЦЦА

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 6 красавіка ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 на званкі будуць адказваць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алёйзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч КАРОЦІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарадскога Савета дэпутатаў Васіль Васілевіч ПАНАСЮК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Шапіру Сямёну Барысавічу, члену Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага і пятага скліканняў, доктару эканамічных навук, прафесару, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне доктару эканамічных навук, прафесару, члену Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання Шапіру Сямёну Барысавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

АЎТАРЫТЭТ ПРАВАСУДДЗЯ НЕЗАЛЕЖНАЙ КРАІНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нельга забываць аб удасканаленні прафесійнага ўзроўню дзеючых суддзяў, для гэтых мэт створаны спецыяльны Інстытут перападрыхтоўкі. «Аднак вы самі, наколькі я інфармаваны, лічыце яго работу нездавальняючай. Вучоба ў ім часам фармальная. Праграмы недастаткова адаптаваныя не толькі на перспектыву, але і да сучаснага жыцця. Пара кардынальна перабудаваць работу гэтага Інстытута, прыцягваць туды найбольш пісьменных, вопытных, падрыхтаваных спецыялістаў, практыкуючых і псіхолагаў. Я думаю, нам гэта пад сілу», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Справа гонару сістэмы

«Непрымальнае, можа быць, і набалелае ў нейкай ступені пытанне барацьбы з карупцыяй у краіне ў цэлым, і, у нейкай ступені, — не скажу, што гэта так ужо распаўсюджана — у судзейскім корпусе. Парадаксальна — суды выносяць вердыкты па карупцыйных злачынствах і ў той жа час асобныя суддзі самі парушаюць закон, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — За апошнія некалькі гадоў шэсць вашых калег былі асуджаныя за карупцыю. Не скажу, што мы пракантралявалі ўсю сістэму на прадмет карупцыі, але факт ёсць факт. Вы ведаеце, колькі яшчэ звольнілі тых, хто запляміў сябе».

На яго думку, гэта, безумоўна, кідае цень на ўсіх работнікаў судзейскага корпуса — пры тым, што абсалютная большасць працуе сумленна і добрасумленна.

«Непрымірымая барацьба з карупцыяй — справа гонару самой судовай сістэмы. Чысціня судзейскіх шэрагаў — аснова яе аўтарытэту. Людзей, схільных да злоўжыванняў, нячыстых на руку, трэба выяўляць і неадкладна ад іх пазбаўляцца, таму што далей будзе горш», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аб ролі Вярхоўнага Суда

Сёння Вярхоўны Суд кіруе ўсімі працэсамі жыццядзейнасці судовай сістэмы краіны. Паводле слоў Прэзідэнта, асноўныя абавязкі вышэйшай судовай інстанцыі — дзейнічаць стратэгічна, ініцыятыўна, працаваць на апярэджанне.

У прыярытэце для Вярхоўнага Суда павінна быць аналітычная работа. Магутны інтэлектуальны патэнцыял, які ён змяшчае, неабходна задзейнічаць у поўную сілу. «У першую чаргу гэта датычыцца фарміравання адзіных падыходаў да прымянення заканадаўства ўсімі судамі. Для гэтага варта павысіць якасць працы Пленума і Прэзідыума Вярхоўнага Суда. Іх прававая пазіцыя павінна быць практыкаўтваральнай для ўсіх праваахоўных органаў», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што вельмі жадае, каб гэтая нарада стала практычнай і былі вынесены канкрэтныя прапановы. Напрыклад, па інфарматызацыі судовай сістэмы. Сучасныя рэаліі гэтага патрабуюць.

«Выкарыстанне ІТ-тэхналогій у вашай дзейнасці дазволіць рацыянальна зрабіць таннейшым судаводства, скараціць судовыя выдаткі. Суды маюць неабходнае абсталяванне для фіксацыі судовага працэсу. Як вы паўнавартасна будзеце карыстацца гэтымі тэхналогіямі? Што перашкаджае адмовіцца ад папяровых пратаколаў судовага пасяджэння? Сёння ўжо пара пачынаць фарміраванне электронных спраў», — задаў пытанні Аляксандр Лукашэнка.

Да 1 верасня 2020 года ўсе пасяджэнні Вярхоўнага Суда павінны ісці без паперы. Арыенцірам на будучае стане такая ж лічбавізацыя сістэмы для раённых судоў. Падключыць да гэтага працэсу Прэзідэнт параіў ІТ-парк і Аператыўна-аналітычны цэнтр. Лічбавізацыя судовых спраў, на думку кіраўніка дзяржавы, запатрабуе ад супрацоўнікаў большага прафесіяналізму і эстэтыкі. Такія навацыі істотна павышаюць адкрытасць і празрыстасць правасуддзя. Да таго ж укараненне электроннага судаводства ўлічваецца пры складанні міжнародных рэйтынгаў, якія вызначаюць узровень развіцця і інвестыцыйнай прывабнасці дзяржавы.

Не павінен быць Вярхоўны Суд і ўбаку ад галоўных кірункаў развіцця грамадства. «Меры, што прымаюцца па стымуляванні прадпрымальніцкай актыўнасці і развіцці лічбавай эканомікі, патрабуюць прававой абароны гэтых працэсаў з боку судовай улады. Задача Вярхоўнага Суда зрабіць так, каб айчынная судовая сістэма адпавядала найлепшым стандартам правасуддзя, карысталася аўтарытэтам у юрыдычнай супольнасці як нашай краіны, так і за мяжой», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Такі падыход будзе садзейнічаць развіццю інавацыйных тэхналогій, прыцягненню замежных інвестыцый і павышэнню канкурэнтаздольнасці эканомікі.

Пад абаронай Прэзідэнта

Пасля выступленняў старшыні Вярхоўнага Суда Валянціна Сукалы і Генеральнага пракурора Аляксандра Канюка, кіраўнік дзяржавы зноў звярнуўся да прысутных.

Прэзідэнт запэўніў прысутных, што судовая ўлада ў нашай краіне з'яўляецца незалежнай і абароненай.

Аднак, дадаў ён, калі хтосьці з суддзяў з гэтым не згодны, то ў гэтым вінаватыя самі суддзі. «Гэта можа пазначацца толькі адным тэрмінам — кругавая парука», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама расказаў, што вельмі жорстка рэагуе на сітуацыі, калі «начальнікі здымаюць трубку і тэлефануюць суддзям». «Гэта апошні дзень яго [начальніка. — **«Звязда»**] работы», — папярэдзіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы зноў звярнуў увагу, што калі хтосьці замінае суддзям сумленна і справядліва прымаць рашэнні, то заўсёды ёсць выйсце. «Адзін толькі званок. І вы ведаеце, каму патэлефанаваць, акрамя мяне. Літаральна праз гадзіну-дзве я буду пра гэта ведаць», — адзначыў беларускі лідар.

Ён падкрэсліў, што заўсёды стане на абарону суддзяў.

Яшчэ Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што судовай сістэме неабходна ўдасканальвацца, пра гэта вядуцца размовы. Прычым развіццё трэба весці не толькі па асобных кірунках, але і глабальна. Дарэчы, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што да нас пастаянна прыязджаюць паглядзець на айчынную судовую сферу і вучыцца — а гэта дарагога варта.

«Суддзі і суд — гэта аснова любога жыцця. Я вельмі хачу, каб у нашай першай, незалежнай беларускай дзяржаве, якую мы з вамі стварылі, быў сапраўдны, адказны і справядлівы суд», — заключыў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ. Марыя ДАДАЛКА.

Проста і зразумела

Выступаючы з дакладам, старшыня Вярхоўнага Суда Валянцін Сукала адзначыў, што неабходна павышаць аператыўнасць аднаўлення парушаных правоў і адкрытасць правасуддзя, а таксама прымаць справядлівыя і зразумелыя людзям рашэнні.

Паводле яго слоў, неабходна ў найбліжэйшы час працягнуць паспяховыя рэформы па павышэнні якасці і аператыўнасці ўсяго працэсу правасуддзя — ад першай да вышэйшай інстанцыі. Валянцін Сукала звярнуў увагу, што людзі хочуць бачыць зразумелыя, жыццёвыя і чалавечыя рашэнні. Працягнецца работа па павышэнні адкрытасці, публічнасці і галоснасці правасуддзя. Судовыя рашэнні будуць публікавацца ў адкрытых банках даных. Найважнейшы кірунак — укараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій. Яшчэ, дадаў ён, аналітычная работа павінна быць паднятая на зусім новы ўзровень.

У сваім дакладзе Генеральны пракурор Аляксандр Канюк спыніўся на агульных для суда і пракуратуры пытаннях.

«На працягу пяці апошніх гадоў павялічваецца колькасць спраў, якія пракуроры вярнулі для дадатковага расследавання ў сувязі з дапушчанымі парушэннямі. У выніку — за апошнія сем гадоў (да статыстыкі можна адносіцца па-рознаму, але тым не менш гэта факт) колькасць апраўданых асоб скарацілася ў 11 разоў», — сказаў Аляксандр Канюк.

Паводле слоў Генпракурора, меры, якія прымаюцца, пакуль што не дазваляюць цалкам пазбегнуць памылак у расследаванні крымінальных спраў і падтрымкі дзяржаўнага абвінавачання.

Далажыў Аляксандр Канюк Прэзідэнту і аб выкананні даручэння па скарачэнні ўдзелу пракурораў у грамадзянскім судаводстве. Пасля аналізу працэсу падыходы перагледжаны (у тым ліку і да апеляцыйнага апратэставання). Па выніках колькасць пратэстаў скарацілася на трэць. «У цэлым, паміж Генеральнай пракуратурай і Вярхоўным Судом наладжана канструктыўнае ўзаемадзеянне, якое дапамагае ў выпрацоўцы адзіных падыходаў, што ўзнікаюць у правапрымянальнай практыцы», — рэзюмаваў Аляксандр Канюк.

«Зялёная картка» — гарант нашай пенсіі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Што датычыцца памеру пенсіі, то калі рабіць адлічэнні з мінімальнай заработнай платы, адпаведна, і працоўная пенсія будзе прызначаная мінімальная. Сёлета яна складае 216,71 рубля.

Калі ў чалавека па дасягненні пенсійнага ўзросту не сфарміраваны страхавы стаж, то яму давядзецца пачакаць узросту 65 гадоў (для мужчын) і 60 гадоў (жанчынам) — тады яму будзе прызначана сацыяльная пенсія. Па параметрах гэтага года яна складае 108,45 рубля. Таму трэба задумвацца аб будучай пенсіі і імкнуцца сфарміраваць свае пенсійныя правы сёння.

Персаніфікаваны ўлік — гэта ўлік і захоўванне па кожным застрахаваным чалавеку даных пра стаж, заробак, налічаныя страхавыя ўзносы, узносы на прафесійнае пенсійнае страхаванне і іншыя звесткі, неабходныя пасля для прызначэння пенсіі.

Менавіта з гэтай мэтай у канцы мінулага года быў прыняты ўказ № 500, які даў права ўдзельнічаць у дзяржаўным сацыяльным страхаванні самазанятым фізічным асобам, якія ажыццяўляюць непрадпрымальніцкую дзейнасць. Цяпер яны самі прымаюць рашэнне, будуць яны выплачваць узносы і ў выніку фарміраваць сабе страхавы стаж, а значыць, права на пенсію ў будучыні, ці не. Такую магчымасць атрымалі людзі, што працуюць на сябе: цырульнікі, рэпетытары, спецыялісты, якія аказваюць касметалагічныя паслугі, паслугі па агратурызме, тыя, хто выконвае малярныя, тынкавальныя работы і іншыя.

Па словах Наталлі Паўлючэнкі, за два месяцы дзеяння ўказа ўжо больш за сто чалавек сталі на ўлік у органы фонду і плануюць выплачваць узносы ў бюджэт ФСАН.

Правілы персаніфікаванага ўліку грамадзян мяняюцца

Каб мець магчымасць разлічыць індывідуальны каэфіцыент для пенсіі, з 2003 года ў нашай краіне ўведзена сістэма персаніфікаванага ўліку грамадзян. Пры гэтым на кожнага работніка адкрываецца індывідуальны асабовы рахунак, і яму выдаецца дзяржаўнае пасведчанне сацыяльнага страхавання. Гэта так званая зялёная картка, якая маецца ў кожнага з нас, хто меў ці мае цяпер работу.

У сістэме персаніфікаванага ўліку сёння адкрыта каля 7,7 мільёна індывідуальных асабовых рахункаў. Па 4,8 мільёна з іх звесткі штогод абнаўляюцца. Таксама штогод адкрываецца каля 120 тысяч новых індывідуальных асабовых рахункаў, з іх 81 тысяча (або каля 67 %) афармляецца на маладых людзей ва ўзросце 14—20 гадоў.

З 4,8 мільёна асабовых рахункаў 4,2 мільёна заведзены на асоб, якія працуюць па класічных працоўных дагаворах. На грамадзянска-прававых дагаворах — 200 тысяч застрахаваных асоб, астатнія 400 тысяч — тыя, хто самастойна выплачвае ўзносы (ІП, натарыусы, адвакаты і іншыя фізічныя асобы, а таксама работнікі са змешанай формай працоўнай дзейнасці).

Сёлета былі ўнесены змяненні ў правілы персаніфікаванага ўліку. Калі раней работадаўцы падавалі індывідуальныя звесткі пра работнікаў з адлюстраваннем зарплаты і выплаты ўзносаў адзін раз у год, то зараз будуць рабіць гэта штоквартальна. Гэта дазволіць звесці да мінімуму сітуацыі, калі наймальнік не дае звесткі ў сувязі са спыненнем дзейнасці арганізацыі.

Таксама будзе пашырана форма персаніфікаванага ўліку, якая характарызуе працоўную дзейнасць чалавека. У пералік звестак, акрамя даты прыёму на работу і звальнення, работы па сумяшчальніцтве цяпер уключана інфармацыя аб прафесіі, пасадзе работніка, відзе працоўнага дагавора, даце і нумары загада аб прыёме на работу, пераводзе на іншую пастаянную работу, прысваенні кваліфікацыйнай катэгорыі, звальненні і яго падставе. Усе гэтыя змяненні ўступяць у сілу з 1 ліпеня 2019 года і, паводле слоў спецыялістаў, дадуць магчымасць больш дэталёва праводзіць маніторынг працоўных рэсурсаў і прагназаваць патрэбнасць рынку ў кадрах. А ў будучыні яны стануць асновай для электроннага ўліку працоўнай дзейнасці.

Святлана БУСЬКО.

Даведка «Звязды»

ДАКЛАДНА ПРА ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ

У адпаведнасці з законам, агульнаўстаноўлены пенсійны ўзрост складзе:

у 2019-м: для мужчын — 61 год 6 месяцаў, для жанчын — 56 гадоў 6 месяцаў;

у 2020-м: для мужчын — 62 гады, для жанчын — 57 гадоў;

ў 2021-м: для мужчын — 62 гады 6 месяцаў, для жанчын — 57 гадоў 6 месяцаў;

у 2022-м і ў наступныя гады: для мужчын — 63 гады, для жанчын — 58 гадоў.

Узрост, які дае права на пенсію па ўзросце на агульных падставах, вызначаецца ў дачыненні да каляндарнага года (года звароту па пенсію), а не да даты нараджэння асобы.

Скарбы зямлі

ГЕОЛАГІ ПРАЦУЮЦЬ НА ПЕРСПЕКТЫВУ

Дасягнуты такі ўзровень разведаных запасаў, якога дастаткова, каб кампенсаваць ужо здабытую колькасць сыравіны

Ці ёсць залежы алмазаў у нашай краіне? Гэтае пытанне ўжо некалькі гадоў цікавіць беларусаў. На яго і шэраг іншых пытанняў напярэдадні Дня геолага, які адзначаюць у першую нядзелю красавіка, прадстаўнікі галіны адказалі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

Фота БелТА.

«У 2018 годзе многія задачы, пастаўленыя перад геолагамі, былі выкананы ў поўным аб'ёме, — заявіў **начальнік галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў Мінпрыроды Васіль КОЛБ.** — У прыватнасці, адзначу прырост разведаных запасаў вуглевадароднай сыравіны. Для Мінпрыроды ў галіне геалагічнага вывучэння нетраў быў устаноўлены важны паказчык — прырост запасаў нафты на 600 тысяч тон, які толькі РУП «НВЦ па геалогіі» перавыкананы на 106,8 %. «Беларуснафта» ў 2018 годзе забяспечыла прырост запасаў нафты ў аб'ёме 1,67 млн тон. Гэта значыць, што ўдалося дасягнуць такога ўзроўню разведаных запасаў, якіх дастаткова, каб кампенсаваць здабытую колькасць сыравіны».

Таксама ў актыў за мінулы год геолагі могуць запісаць прырост разведаных прэсных падземных водаў у аб'ёме 57,7 тыс. м³/суткі пры плане 45,0 тыс. м³/суткі (128 % ад плана) і мінеральных падземных водаў — 827,6 тыс. м³/суткі пры плане 30,0 тыс. м³/суткі (або больш за 2000 % ад плана).

Летась забяспечаны прырост прамысловых запасаў сыравіны, неабходнай для будаўнічай галіны. Напрыклад, прырост запасаў будаўнічых пяскоў на 152,4 % больш, чым у 2017 годзе, пяскана-гравійнай сумесі — 27 611,2 тыс. м³ (або 138,1 % да 2017 года). У 2018 годзе зацверджаны запасы такога перспектыўнага карыснага выкапня як трэпел. На базе радовішча «Сталёвае» ў Магілёўскай вобласці працуе вытворчасць, цяпер рыхтуецца яшчэ адзін участак для здабычы сыравіны. У наступныя пяць гадоў будзе раскрывацца новае радовішча будаўнічага каменю «Сітніцкае».

Па словах Васіля Колба, разведанае радовішча часцей за ўсё перадаецца ў распрацоўку, гэта значыць, ствараецца новае прадпрыемства. У гэтым зацікаўленыя арганізацыі ўсіх формаў уласнасці. Іх дзейнасць прыносіць добры даход у казну: па выніках 2018 года, фінансавыя сродкі, атрыманыя ад падатку за здабычу карысных выкапняў, склалі больш за 550 млн рублёў.

Прэзідэнт даручыў вывучыць усю тэрыторыю краіны, каб дакладна ведаць, якія карысныя выкапні ў нас ёсць, а якіх — няма. Таксама пастаўлена задача забяспечыць максімальнае скарачэнне імпарту сыравіны, якая ёсць у Беларусі. «Геолагі могуць разведаць радовішча, але трэба пралічваць эканамічную мэтазгоднасць, таму што часам імпартаваць больш выгадна, чым здабываць», — адзначыў прадстаўнік Мінпрыроды.

У той жа час Беларусь сама з'яўляецца экспарцёрам карысных выкапняў. Цяпер вельмі актыўна развіваецца торфаздабыўная галіна. Расце рынак збыту гэтага карыснага выкапня, павялічваюцца разведваемыя плошчы. Торф верхавога тыпу адпраўляецца на экспарт у краіны Еўрасаюза. «Мы маем добрыя паказчыкі як па здабычы, так і па вытворчасці торфу», — сказаў Васіль Колб. Ён падкрэсліў, што ўсім вядомы торф як мясцовы від паліва, аднак ён ужываецца яшчэ ў сельскай і цяплічнай гаспадарках, а таксама прадукты перапрацоўкі торфу выкарыстоўваюцца і ў іншых галінах.

Вядома, што Беларусь будзе паступова адмаўляцца ад пластыкавай тары. Сёння ў нас дастаткова сыравіны — кварцавых пяскоў і магутнасцяў ААТ «Гомельшкло», каб выпускаць неабходную колькасць шкляных бутэлек. Праблема ў іншым: у нас толькі тры прадпрыемствы маюць лініі па разліву пітной і мінеральнай вады ў шкляную тару. Тым не менш пры правільным разліку і мадэрнізацыі прадпрыемстваў пераход на шклатару можна паспяхова ажыццявіць.

З чым не шанцуе Беларусі, дык гэта з каштоўнымі металамі і камянямі. Сціхлі размовы аб рэсурсах золата пад Стоўбцамі, зрэшты, адразу казалі, што на сёння яно занадта глыбока залягае, і здабыча атрымаецца залатой ва ўсіх сэнсах слова.

Нават бурштыну ў нашай краіне здабылі ўсяго толькі 70 тон і прыйшлі да высновы, што гэта эканамічна нявыгадна.

Што датычыцца алмазаў, то, па словах **намесніка генеральнага дырэктара РУП «Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі» Галіны КАЧАНКО,** сёння дакладна сказаць, ці ёсць яны ў нетрах Беларусі, нельга. Яна нагадала, што некалькі гадоў таму была ўскрытая трубка выбуху Жлобінскага поля і там знайшлі два маленькія алмазы. Тады спрабавалі зразумець: гэта выпадковая знаходка ці не. Між тым у Якуціі на пошук алмазаў выдаткавалі больш за 30 гадоў. Геалогія, на думку спецыяліста, гэта тая галіна, якая працуе на перспектыву. Тое, што сёння не выгадна, заўтра можа быць рэнтабельна. Па практыцы, якая склалася, ад разведкі да стварэння вытворчасці праходзіць мінімум пяць гадоў, а бывае, што і 15. «Імгненнай выгады ад геалогіі не варта чакаць», — рэзюмавала Галіна Качанко. Разам з тым, у мэтах умацавання ўласнай мінеральна-сыравіннай базы, якая з'яўляецца асновай нацыянальнай бяспекі краіны, беларускімі геолагамі на пастаяннай аснове прыкладаюцца ўсе намаганні і веды, каб валодаць поўнай інфармацыяй аб наяўных рэсурсах.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.

Чаму «буксуе» лічбавая трансфармацыя?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Еўрасаюзе падлічылі, што толькі за кошт укаранення лічбавага подпісу Эстонія сэканоміла 10 % ВУП. 99 % банкаўскіх транзакцый тут адбываюцца анлайн, і ўсе даўно забыліся, як выглядаюць банкаўскія чэкі...

Сёння назіраецца крытычны разрыў паміж тым, як рыхтуюць у ВНУ, і тым, каго чакаюць у індустрыі і бізнесе.

Эстонская адукацыйная дзяржаўная IT-сістэма (EHIS) уяўляе сабой базу, у якой прадстаўлены даныя ўсіх устаноў адукацыі (ад дзіцячых садкоў да ВНУ), усіх педагогаў і навучэнцаў, а таксама інфармацыя пра іх паспяховасць, вынікі здадзеных экзаменаў і тэстаў, атрыманыя сертыфікаты, пасведчанні, узнагароды і гэтак далей. У Эстоніі няма ніводнай навучальнай установы, якая не прысутнічае ў EHIS. Уся дзяржаўная статыстыка, фінансаванне, друкаванне пасведчанняў аб заканчэнні школы і іншае, што датычыцца кіравання, ажыццяўляецца на падставе даных гэтай сістэмы. Інфармацыя існуе толькі ў электронным выглядзе. Даныя ў EHIS уводзяць праз інтэрнэт непасрэдна самі навучальныя ўстановы. Яны ж адказваюць за іх якасць і праўдзівасць. Калі з'яўляецца нейкая новая інфармацыя, яна павінна быць унесена ў агульную базу на працягу 24 гадзін.

Таксама ў Эстоніі створана вэб-асяроддзе для камунікацыі ў сферы адукацыі — сістэма «электронная школа» (e-School). Праз гэтую платформу настаўнікі адзначаюць наведвальнасць, выстаўляюць ацэнкі і адпраўляюць дамашнія заданні школьнікам. Самі школьнікі могуць выкарыстоўваць платформу для загрузкі выкананага дамашняга задання, а свае найлепшыя работы дадаваць у электроннае партфоліа. Бацькі таксама адсочваюць актыўнасць сваіх дзяцей у школе, праглядаюць іх дамашняе заданне, а пры неабходнасці звяртаюцца да настаўнікаў. У сістэме створаны профілі педагогаў. Гэта як маленькая сацыяльная сетка. Калі настаўнік, дзіця ці бацькі маюць пытанні ці заўвагі, яны пішуць адзін аднаму...

Асобнага прадмета «інфарматыка» ў школьнай праграме ў Эстоніі няма, а лічбавыя кампетэнцыі ў школьнікаў развіваюцца на кожным уроку. Між іншым, з нядаўняга часу для ацэнкі лічбавай кампетэнтнасці навучэнцаў у краіне пачалі ўкараняцца тэсты. Заданні скіраваны на праверку здольнасці навучэнцаў шукаць, упарадкоўваць і апрацоўваць інфармацыю, кантактаваць у лічбавым асяроддзі з захаваннем сеткавага этыкету і чужых правоў на інтэлектуальную уласнасць, уменне ствараць і развіваць уласны лічбавы кантэнт, абараняць персанальныя даныя, вырашаць розныя праблемы, якія ўзнікаюць у лічбавым свеце, разумець прасцейшыя мовы праграмавання...

А сёння ў Эстоніі працуюць ужо над стварэннем прававых рамак для выкарыстання штучнага інтэлекту (этычных і тэхналагічных стандартаў). Рыхтуецца законапраект для вырашэння прававых пытанняў, звязаных са штучным інтэлектам, які павінен унесці юрыдычную яснасць і ўсяліць упэўненасць пры выкарыстанні алгарытмаў у такіх абласцях, як медыцына, адукацыя, транспарт і іншых.

«Сакрэтны рэцэпт» поспеху

— Лічбавая трансфармацыя адукацыі сёння актуальная для многіх краін свету. Большасць з іх пакуль знаходзяцца на этапе пераводу папяровых носьбітаў у лічбавыя (дарэчы, як і мы), але

Андрэс АРЭМАА: «99 % усіх сэрвісаў даступныя ў Эстоніі анлайн».

трэба рухацца далей, мы павінны выкарыстоўваць новыя тэхналогіі для трансфармацыі адукацыйнага працэсу, — разважае **брэнд-дырэктар адзінай платформы электронных сэрвісаў для адукацыі znaj.by Аляксандр ЦЕПЛЯКОЎ**. — Трэба перабудаваць сістэму адукацыі, змяніць цяперашнія ролі настаўніка і вучня. Першы ўжо не можа быць проста «рупарам», а другі — «губкай». Настаўнік павінен пераўвасобіцца ў мадэратара і эксперта, а вучні — адысці ад звычайнага ўзнаўлення пачутай на ўроку інфармацыі і стаць «вырашальнікамі праблем» з развітым крытычным мысленнем.

«У нас няма праблем з тэхналогіямі. Ёсць праблемы з далучэннем навучэнцаў, — лічыць выканаўчы дырэктар New Media Consortium (ЗША) Ідэн Дальстрэм. — Толькі ад чатырох да сямі працэнтаў навучэнцаў матываваныя да вучобы».

Той кантэнт, што генерыруе інтэрнэт, надзвычай цікавы і разнастайны, і вучэбнаму канкураваць з ім вельмі складана. Да 2030 года колькасць навучэнцаў у свеце павінна падвоіцца, і адна з глабальных задач, якія стаяць перад адукацыяй ва ўсім свеце, — забяспечыць уцягнутасць падрастаючага пакалення ў вучобу і ў разы павялічыць колькасць матываваных.

Тэхналогія дапоўненай рэчаіснасці, віртуальная рэчаіснасць, Big Data — усё гэта дазваляе зрабіць вучэбны працэс больш эмацыянальным і менш руцінным. Дапоўненая рэчаіснасць (AR) — адна з самых перспектыўных тэхналогій XXI стагоддзя. Сфера яе прымянення — ад гульнявой індустрыі да медыцыны. З кожным годам тэхналогія ўсё больш удасканальваецца і становіцца карысным інструментам, а не проста забавай.

— «Сакрэтны рэцэпт» укаранення сучасных тэхналогій даволі просты. Спачатку трэба стварыць вобраз (разабрацца, навошта вам тэхналогіі, чаго вы хочаце дабіцца і якую ставіце мэту?). Затым падрыхтаваць педагогаў. Забяспечыць камфортнае існаванне ў лічбавым асяроддзі будзе, напэўна, самым складаным, — канстатуе Аляксандр Цеплякоў. — І толькі затым трэба думаць пра інфраструктуру (інтэрнэт, праграмнае забеспячэнне і «жалеза»). Поспех будзе, калі дзіця зможа навучацца на новым, больш якасным узроўні. Адміністрацыя прэзідэнта Абамы не здолела вырашыць калісьці гэту задачу, проста аблічбаваўшы носьбіты...

Аляксандр Цеплякоў заўважыў, што сёння назіраецца крытычны разрыў паміж тым, як рыхтуюць у ВНУ, і тым, каго чакаюць у індустрыі і бізнесе. Між іншым, 15 кампаній-гігантаў, сярод якіх Google, Apple, IBM, Ernst@Young, Hilton і іншыя, ужо не патрабуюць ад саіскальнікаў прад'яўлення дыплома аб вышэйшай адукацыі. Пад увагу бяруцца толькі іх кампетэнцыі.

У свеце існуе больш як 50 адукацыйных анлайн-платформ, многія з якіх даюць магчымасць навучацца бясплатна. Цяпер доступ да якасных ведаў можна атрымаць з любога пункта на планеце. З'явілася магчымасць, не ўстаючы з канапы, паслухаць вядомых прафесараў і паўдзельнічаць у абмеркаваннях на форумах курсаў. Змяняецца сам фармат навучання. Замест таго, каб атрымліваць тое ж, што і іншыя, можна атрымаць адаптаваны менавіта пад цябе досвед, стварыць персанальную траекторыю навучання.

...І персанальны «целаахоўнік»

Дырэктар галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Павел ЛІС падкрэслівае: «Пытанне хуткасці ва ўкараненні лічбавых рашэнняў — адно з самых надзённых. Лічбавізацыя — гэта магчымасць кіравання сістэмай адукацыі на аснове аналізу вялікіх даных, індывідуальная адукацыйная траекторыя, выбудаваная нейроннай сеткай, праверка дамашніх заданняў штучным інтэлектам і гэтак далей. Зараз я кажу пра нашы чаканні. Але ў рэчаіснасці мы сутыкаемся з неразуменнем неабходнасці лічбавай трансфармацыі, жаданнем скінуць усё на IT-сектар, непрыняццем інавацый. Мы не ўмеем працаваць з негатыўным вопытам, памылкамі і рабіць з іх правільныя высновы... Даводзіцца канстатаваць і няўзгодненасць дзеянняў паміж рознымі галінамі. Лічбавая трансфармацыя — не мода і не часовая з'ява, як хтосьці памылкова думае, а працэс, у які трэба паглыбіцца як мага хутчэй».

Павел ЛІС: «Пытанне хуткасці ва ўкараненні лічбавых рашэнняў — адно з самых надзённых...»

Ёсць і такая праблема, як жаданне аблічбоўваць пры адсутнасці адпаведных навыкаў і кампетэнцый. Сёлета пры ГІАЦ Мінадукацыі плануецца адкрыць адукацыйны цэнтр па павышэнні IT-кампетэнцый выкладчыкаў, адміністратараў і менеджараў па такіх адукацыйных праграмах, як асновы вэб-распрацоўкі, рэляцыйныя базы даных у інфармацыйных працэсах, бяспека інфармацыйных тэхналогій, бяспечная работа ў інтэрнэце. Навучанне будзе накіравана на прасоўванне IT-тэхналогій і ўключэнне ў гэтыя працэсы педагогаў. Акрамя таго, асаблівая ўвага будзе аддадзена стасункам педагогаў і кіраўнікоў устаноў адукацыі з вучнямі і іх бацькамі ў сацыяльных сетках і месенджарах.

Асноўным правадніком лічбавай трансфармацыі з'яўляецца педагог — гэта ўсе разумеюць, але чым сёння даводзіцца займацца ў школах? Вось толькі невялікі пералік папер, якія рыхтуюцца ва ўстановах адукацыі: штомесячна здаюцца справаздачы па арганізацыі харчавання, па занятасці навучэнцаў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, наведванні сацыякультурных устаноў. Штоквартальна — аб выкананні плана мерапрыемстваў у рамках Дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека», па прафілактыцы суіцыдальных паводзінаў і спажывання наркатычных і псіхатропных рэчываў, па тэматыцы і часе правядзення бацькоўскіх сходаў.

Сацыяльны пашпарт установы адукацыі рыхтуецца раз у паўгоддзе. Падаецца інфармацыя па аздараўленні навучэнцаў у летні перыяд, па дзейнасці дзённых лагераў у канікулярны час, інфармацыя аб правядзенні выпускных вечароў і апошніх званкоў. Рыхтуюцца справаздачы па месячніку здаровага ладу жыцця, прававога выхавання, прафілактыцы гвалту ў сям'і, бяспечнай жыццядзейнасці, інфармацыя аб вакцынацыі дзяцей і шмат іншай. Электронныя дзённікі і журналы ў абавязковым парадку дублююцца на папяровых носьбітах...

Ці спросціць жыццё школам

Асобнага прадмета «інфарматыка» ў школьнай праграме ў Эстоніі няма, а лічбавыя кампетэнцыі ў школьнікаў развіваюцца на кожным уроку.

Рэспубліканскае інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе, якое зараз ствараецца? Мяркуецца, што адзіная платформа ахопіць усе ўзроўні адукацыі, стане часткай электроннага ўрада, адпаведна, закрые ўсе патрэбы ў зборы і апрацоўцы даных.

Рэгістр навучэнцаў ужо напаўняецца інфармацыяй. У ідэале неабходна, каб даныя туды паступалі адразу з рэгістра насельніцтва, — гэта дасць магчымасць зняць з настаўнікаў велізарны пласт работ, вырашыцца і праблема ўсенавучання. Па сутнасці, з'явіцца лічбавы партрэт навучэнца, які аб'яднае інфармацыю пра ўстановы адукацыі, у якіх ён навучаўся, у тым ліку і дадатковай адукацыі, яго паспяховасць, медыцынскі складнік, спартыўныя дасягненні, атрыманыя на конкурсах і алімпіядах дыпломы. Маючы звесткі пра паспяховасць навучэнцаў у засваенні тых ці іншых прадметаў па ўсёй краіне, можна будзе прымаць кропкавыя кіраўніцкія рашэнні па карэкціроўцы, напрыклад навучальных праграм, па дапамозе пэўным рэгіёнам і пэўным навучальным установам, прагназаваць размеркаванне патокаў па розных установах адукацыі пасля заканчэння школы. На платформе будуць прадстаўлены таксама рэгістр устаноў адукацыі (ён мадэрнізуецца) і рэгістр педагагічных работнікаў (знаходзіцца ў працэсе стварэння).

Кансультант па бяспецы асабістага профілю, куратар інфармацыйнай бяспекі і кіберследчы — вось тры самыя перспектыўныя прафесіі найбліжэйшай будучыні.

На думку **начальніка аддзела інфармацыйных тэхналогій і абароны інфармацыі ГІАЦ Мінадукацыі Максіма БАГАТКІ**, асабліва будуць запатрабаваныя кансультанты па бяспецы асабістага профілю. Гэта будуць персанальныя «целаахоўнікі» вашых персанальных даных: яны будуць сачыць і за вашым іміджавым складнікам, каб вы не выстаўлялі ў сеціве непажаданы кантэнт, які зможа вам нашкодзіць ці скампраметаваць.

— Кожны чалавек хоча адчуваць сябе абароненым. Але калі раней людзі закрывалі акаліцы і вешалі вялікія замкі, то сёння ўсіх хвалюе інфармацыйная бяспека і пагрозы, з ёй звязаныя, — падкрэслівае спецыяліст. — Між іншым, толькі за чацвёрты квартал 2018 года ад хакерскіх атак у свеце пацярпелі 765 мільёнаў чалавек, было страчана 50 мільёнаў долараў. І 53 % усіх пагроз былі накіраваныя на атрыманне доступу да персанальных даных.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота прадастаўлена ГІАЦ Мінадукацыі.

24 ТЫСЯЧЫ ЗАЯВАК СА 106 КРАІН...

І конкурс тры чалавекі на месца

Праграма па наборы валанцёраў на II Еўрапейскія гульні, якая працягвалася паўтара года, завершана. Начальнік упраўлення па рабоце з валанцёрамі фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Надзея АНІСАВЕЦ адзначае, што арганізатарам удалося дасягнуць прыкметных вынікаў.

«Было пададзена 24 168 заявак кандыдатамі са 106 краін свету. Для работы на форуме неабходна восем тысяч валанцёраў плюс 700 чалавек — для рэзерву, — расказвае Надзея. — *Працаваць яны будуць у 34 функцыянальных кірунках. Прычым іх задзейнічаюць не толькі ў Мінску на аб'ектах Гульняў, але і па ўсёй Беларусі: у рэгіянальных фан-зонах, а таксама ў пунктах пропуску праз дзяржаўную мяжу, дзе яны будуць дапамагаць гасцям, спартсменам і балельшчыкам»*.

Конкурс на вакантнае месца склаў тры чалавекі. У Дырэкцыі адзначаюць, што часам даводзілася адмаўляць вельмі вопытным кандыдатам. У выніку на Гульнях будзе працаваць каля 300 замежных валанцёраў, астатнія валанцёры з Беларусі. Для іх ужо прайшла серыя агульных трэнінгаў, напярадзе функцыянальныя і аб'ектавыя трэнінгі. Цяпер валанцёры прыступілі да работы на першым неспартыўным аб'екце — Міжнародным экіпіровачным і акрэдытацыйным цэнтры.

Арганізатары вылучаюць тры тыповыя партрэты валанцёраў II Еўрапейскіх гульняў: малады валанцёр — студэнт, дарослыя людзі, якія маюць досвед работы на буйных спартыўных мерапрыемствах і «сярэбраныя валанцёры» — людзі, якія не могуць прапусціць такое мерапрыемства, нягледзячы на тое, што ўжо не маладыя. Дарэчы, самым дасведчаным валанцёрам на Гульнях у Мінску стане 81-гадовая прадстаўніца Вялікабрытаніі, у партфоліа якой вялікая колькасць Алімпійскіх гульняў. Яна будзе працаваць у функцыянальным кірунку «Камунікацыі».

Першы намеснік генеральнага сакратара Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Іна Лемяшэўская нагадала, што ў рамках пагаднення з Дырэкцыяй прадугледжана навучанне 300 валанцёраў навыкам аказання першай дапамогі па міжнародным стандарце.

Таксама па яе словах, узнікла дадатковая патрэба ў падрыхтоўцы сцюардаў (да 1,1 тысячы) для аб'ектаў Гульняў.

У ТЭМУ

4—5 красавіка ў Мінску прайшла Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «II Еўрапейскія гульні — 2019: псіхолага-педагагічныя і медыка-біялагічныя аспекты падрыхтоўкі спартсменаў». На канферэнцыі абмяркоўваліся сістэмы спартыўнага адбору, падрыхтоўкі атлетаў і трэнераў, сучасныя тэхналогіі псіхалагічнага і медыцынскага суправаджэння. Удзел у мерапрыемстве прынялі міністр адукацыі Ігар Карпенка, старшыня Каардынацыйнай камісіі II Еўрапейскіх гульняў Спірас Капралас і рэктар БДУФК Сяргей Рэпкін, больш за 200 навукоўцаў, прадстаўнікоў устаноў вышэйшай адукацыі, спартыўных школ і арганізацый, федэрацый па відах спорту з Беларусі, Расіі, Украіны, Арменіі, Узбекістана, Літвы, Польшчы і Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Сталічны ЧАС

● Імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё» праіндэксаваны ў Мінску, паведамляе БелТА. Індэкс росту кошту будаўніцтва жылля ў параўнанні з яго коштам на 31 снежня 1991 года для індэксацыі чэкаў устаноўлены ў памеры Вr18,019. Гаворка ідзе пра выкарыстанне грамадзянамі і членамі іх сем'яў, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, для выплаты паявога ўзносу ў жыллёвым або жыллёва-будаўнічым кааператыве, фінансавання індывідуальнага або калектыўнага жыллёвага будаўніцтва, рэканструкцыі аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылля шляхам куплі, а таксама для пагашэння запазычанасці па крэдытах банкаў (уключаючы выплату працэнтаў за карыстанне імі) і пазыках юрыдычных асоб, выкарыстаных на ўказаныя мэты.

● Сёлета ў сталіцы на аўтастаянках плануецца абсталяваць 20 велапарковак, яны з'явяцца ва ўсіх раёнах горада, паведаміў БелТА галоўны інжынер дзяржаўнага аб'яднання «Гаражы, аўтастаянкі, паркоўкі» Пётр Пруднікаў. Аб'яднанне вывучае попыт на паслугу, мінчане па тэлефоне арганізацыі або на аўтастаянках могуць пакідаць заяўкі аб неабходнасці захоўвання роварaў. «Да нас паступаюць такія званкі, праводзім конкурс на закупку канструкцый. Мяркуецца, што пляцоўкі будуць размешчаны на 32 месцы кожная», — расказаў Пётр Пруднікаў. Усяго на балансе аб'яднання знаходзяцца больш за 100 аўтастаянак, на шасці з іх абсталяваны велапаркоўкі. З 8 красавіка тарыф на захоўванне роварaў складзе Вr7 у месяц, для кліентаў, з якімі заключаны дагаворы захоўвання транспартных сродкаў, — Вr5. Велапаркоўкі ў сталіцы сталі ўладкоўваць з 2009 года.

Извещение о проведении 10 мая 2019 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль»

Предмет торгов
«Здание реципиентной станции» общей площадью 164,5 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 630/С-74287, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143/28
Сведения о земельном участке: площадь – 0,1459 га, кадастровый номер – 623850100003002857
Начальная цена: 37 616,27 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка: 3 700,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «Электромодуль», ул. Великий Гостинец, 143, 222310, г. Молодечно.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предметов торгов в соответствии с протоколом о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 10 мая 2019 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 08.04.2019 по 04.05.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(0176) 74-72-04 (ОАО «Электромодуль»)

«Слуцкаму краю» — сто гадоў

Раённая газета «Слуцкі край» у сакавіку адзначыла сто гадоў. Гэта свята не толькі для калектыву выдання, але і наогул для ўсіх жыхароў рэгіёна, падпісчыкаў і чытачоў. Бо любімая «раёнка» заўжды была з імі, як кажуць, і ў горы, і ў радасці.

— Наша газета — адна з найстарэйшых у краіне. Для нас гонар працаваць у выданні з такой багатай гісторыяй. Гонар быць пераемнікамі найлепшых традыцый журналістаў-папярэднікаў выдання, людзей таленавітых, натхнёных, адважных, творчых, бясконца адданых сваёй справе, — гаворыць **галоўны рэдактар Ірына КАВАЛЕНКА.** — Да юбілею выдання журналісты пачалі рыхтавацца загадзя. На працягу гэтага года расказвалі пра «Слуцкі край», людзей, якія рабілі газету раней, няштатных аўтараў і чытачоў, пра тых, каму газета стала сапраўдным памочнікам, каму дала пуцёўку ў прафесію.

Неаднаразова выданне мяняла назву: «Плуг і молат», «Вясковы будаўнік», «Ленінскі шлях», «Праўда на рубяжы», «За сацыялістычную Радзіму», «Шлях Ільіча». Асобная старонка — Вялікая Айчынная вайна. На акупаванай ворагам тэрыторыі 1 красавіка 1943 года пачала выходзіць на беларускай мове газета «Народны мсцівец» — орган Слуцкага падпольнага раённага камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Рэдакцыяй газеты ў 1943 годзе быў выдадзены паэтычны зборнік беларускага паэта Анатоля Астрэйкі «Слуцкі пояс».

У 2015 годзе газета «Слуцкі край» стала пераможцам XI Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая Літара» ў намінацыі «Найлепшыя матэрыялы культурнай і гісторыка-краязнаўчай тэматыкі».

Падрыхтавала Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

«Звязда» віншуе калег з самавітым юбілеем.

КАЛЯНДАР СТАРЫХ ПАШТОВАК

У Мінску выдадзены перакідны каляндар «Адзіныя гістарычныя карэнні Расіі і Беларусі ў перыяд Расійскай імперыі/ 2019».

Дванаццаць месяцаў — дванаццаць старых паштовак. Калі быць дакладным — рэпрадукцый старых паштовак. Усе ілюстрацыі — з калекцыі мінскага збіральніка даўніны лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава. Студзень знаёміць нас з помнікам расійскаму імператару Аляксандру II. Люты — з Рускай настаўніцкай семінарыяй (раней у гэтым будынку размяшчаўся каталіцкі манастыр і шасцікласнае вучылішча дамініканскага ордэна). Сакавік у календары прадстаўляе Пушкінскую вуліцу ў Брэст-Літоўску. Следам — філакартычныя сустрэчы з красавіком і іншымі месяцамі. Надзвычай цікавае падарожжа!

Калекцыянер Уладзімір Ліхадзедаў у гэтым творчым праекце аб'яднаўся з Пасольствам Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

— Гэта не першы мой зварот да расійскай тэматыкі, — расказвае Уладзімір Аляксеевіч. — Дружба нашых народаў на працягу розных гістарычных часін сталася асновай і маіх выставак, і многіх публікацый з выкарыстаннем даўно выдадзеных паштовак, а таксама тэмай маіх кніг і альбомаў у серыі «У пошуках страчанага», што пабачылі свет у розных выдавецтвах Беларусі. Арыгінальнае дызайнерскае рашэнне, цікавае паліграфічнае выкананне ў выпадку з календаром дазваляе выкарыстоўваць рэпрадукцыі як звычайныя паштоўкі, дазваляе адпраўляць іх у вандроўку па розных адрасах.

Ужо сам па сабе каляндар «Адзіныя гістарычныя карэнні Расіі і Беларусі ў перыяд Расійскай імперыі/ 2019» — калекцыйны прадмет, які будзе, несумненна, прыцягваць увагу і па-за межамі 2019 года.

Сяргей ШЫЧКО.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

НАШЫ ЗАПАСЫ ВЫРАСЛІ НА 150 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

Золатавалютныя рэзервовыя актывы нашай краіны на 1 красавіка склалі 7 мільярдаў 245,6 мільёна долараў (у эквіваленце).

Такім чынам, за сакавік міжнародныя рэзервы выраслі на 150,5 мільёна долараў (на 2,1 працэнта) пасля росту ў лютым 2019 года на 77,5 мільёна (на 1,1 працэнта). Вядома, што ў сакавіку ўрадам і Нацыянальным банкам краіны выканана знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля 316 мільёнаў долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

БРЭСТ — КУЛЬТУРНАЯ СТАЛІЦА СНД

У пятніцу Брэст афіцыйна стаў культурнай сталіцай Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Сертыфікат, які пацвердзіў гэты статус, уручыў сустаршыня Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельнікаў СНД Міхаіл ШВЫДКОЙ.

Гэта ўрачыстая падзея адбылася на гала-канцэрце майстроў мастацтваў у брэсцкім комплексе «Віктарыя». Канцэрт сабраў многіх вядомых артыстаў і заслужаныя калектывы. У іх ліку — Дзяржаўны ансамбль танца Беларусі, рускі народны аркестр «Масква», украінскае вакальна-інструментальнае трыа «Лелія», кампазітар Яўген Дога і спявак Рэнат Ібрагімаў. Да святочнай падзеі прымеркаваныя і выстаўка майстроў жывапісу, круглы стол «Інтэграцыя нацыянальных культур у сучасным свеце».

У БРЭСЦЕ АДКРЫЛІ НОВЫ ЗАВОД

Завод па вытворчасці лакаў і фарбаў узведзены ў свабоднай эканамічнай зоне «Брэст».

Прадпрыемства створана кампаніяй «Дыском», якая ўваходзіць у міжнародны канцэрн DAW SE (Германія), яно працягвае тэхналагічны ланцуг са створаных раней вытворчасцяў сухіх будаўнічых сумесяў і водна-дысперсійных фарбаў.

На заводзе наладжана вытворчасць алкідных лакаў і эмаляў па арыгінальных рэцэптурах. Магутнасць завода на першым этапе складзе тры тысячы тон прадукцыі ў год.

— Адкрыццём трэцяга па ліку завода ў Беларусі мы працягваем развіццё як нашай уласнай інвестыцыйнай палітыкі, так і дзяржаўнай стратэгіі па імпартазамяшчэнні. У будаўніцтва завода ўкладзена 2 мільёны еўра, тут створана 20 рабочых месцаў — сказаў **генеральны дырэктар замежнага прадпрыемства «Дыском» Віктар НАУМАВЕЦ**.

Большая частка прадукцыі брэсцкага прадпрыемства будзе накіроўвацца на экспарт, пастаўкі запланаваныя ў Расію, Украіну, Грузію.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«АДНАЎЛЕННЕ СВЯТЫНЬ. КРЫНІЦЫ БЕЛАРУСІ»

Пад такой назвай 12 красавіка стартуе абноўлены рэспубліканскі праект БРСМ.

У гэты дзень валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» і байцы студэнцкіх атрадаў з усіх куткоў Беларусі зойдуцца навядзеннем парадку на Мсціслаўскай зямлі ў Магілёўскай вобласці.

У цэнтры ўвагі маладзёжнага клопату будзе добраўпарадкаванне тэрыторыі Свята-Пустынскага Успенскага мужчынскага манастыра і адной з трох яго гаючых крыніц. Актывісты БРСМ ачысцяць ад леташняга лісця, сухастою і бураломy прылеглую да манастыра тэрыторыю, закладуць на ёй сад з 75-ці пладовых дрэў і ўстановяць лаўкі.

Вялікая работа плануецца і па ўладкаванні крыніцы, якую ў народзе называюць Ефрасіннеўскай. Сіламі добраахвотнікаў БРСМ плануецца рэканструяваць лесвіцу з парэнчамі, якая вядзе да крыніцы і зробіць над ёй навес, абсталяваць каптажную камеру для зручнасці набору гаючай вады пілігрымамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МІСІЯ — ЗЛАМАЦЬ СТЭРЭАТЫП

Зрабіць шчаслівым ляжачага хворага можна, упэўнены фізіятэрапеўт дзіцячага хоспіса

Юрый Абадзінскі працуе ў сферы, якую традыцыйна лічаць жаночай. Афіцыйна назва яго прафесіі гучыць як медыцынская сястра па ЛФК. Ён займаецца з дзецьмі са складанымі дыягназамі ў Беларускім дзіцячым хоспісе (і ламае стэрэатыпы, што працаваць з малымі могуць толькі жанчыны). Юрый упэўнены, што жыццё нават з самай цяжкай хваробай можна пастарацца зрабіць камфортным. А яго місія — дапамагчы ў гэтым.

ПРА ВЫБАР ПРАФЕСІІ

Яго Юрый называе выпадковым. А для яго вайсковай сям'і, дзе ўсе былі звязаны з палётамі і небам, дзе нават маці — кандыдат у майстры па парашутным спорце, ён увогуле стаў нечаканым. Спачатку, як і бацькі, Юрый захапляўся парашутным спортам, меў трэці разрад. А ў медыцынскае вучылішча вырашыў паступаць за кампанію з сяброўкай, праўда, навучанне адразу спадабалася. Пасля службы ў войску, папрацаваўшы нейкі час масажыстам у паліклініцы, Юрый перайшоў у дзіцячы цэнтр карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі, займаўся з дзецьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Там упершыню адчуў, што атрымлівае задавальненне ад працы, бо дапамагае тым, хто мае ў гэтым вялікую патрэбу, і кожны дзень бачыць вынікі — прагрэс сваіх выхаванцаў.

— Далей мой выбар быў ужо асэнсаваны. Я вырашыў удасканальваць веды ў сферы рэабілітацыі дзяцей і паступіў у акадэмію фізвыхавання (цяпер універсітэт фізічнай культуры. — **Аўт.**) на факультэт адаптыўнай фізічнай культуры.

Пасля пэўны час ён працаваў у адным з санаторыяў інструктарам па лячэбнай фізкультуры, аднак прызнаецца, што сумаваў па рабоце з асаблівымі дзецьмі. Усё стала на свае месцы, калі аднойчы ён звольніўся з санаторыя і перайшоў у дзіцячы хоспіс.

ПРА «ХАТНЮЮ» ПРАЦУ

Асноўная работа фізічнага тэрапеўта з дзецьмі, якія знаходзяцца пад апекай хоспіса, — па дамах. Прычым важна не толькі выканаць пэўныя практыкаванні, але і навучыць ім бацькоў. Бо займацца з такімі дзецьмі варта штодзень.

— Фізічны тэрапеўт павінен валодаць і мануальнымі тэхнікамі, і прыёмамі масажу, ведаць біямеханіку — як рухаюцца рукі, ногі, а таксама фізіялогію: у якую позу дзіця можна пасадзіць, пакласці ці паставіць, — пералічвае спіс кампетэнцый Юрый. — Знаходзячыся ў паліятыўнай групе, дзіця можа пражыць і 20, і 40 гадоў. Наша задача — палепшыць якасць жыцця, зрабіць яго больш камфортным. Мы працуем

і з асяроддзем, якое акружае, і з бацькамі, і з самім дзіцем. Прычым работа камандная: фізіятэрапеўт, псіхолаг, медсястра — кожны ўносіць нешта сваё. Мая задача — не толькі выканаць пэўныя практыкаванні, а зрабіць так, каб дзіцяці было зручна сядзець, ляжаць. Мэбля павінна быць індывідуальна прыстасавана да гэтага малога. Часта даводзіцца адаптаваць тыя рэчы, якімі яно карыстаецца: перарабляць крэсла, ложак, падказваць бацькам, як можна ўдасканаліць ці дзе набыць штосьці адпаведнае.

Працуе Юрый у праграме мабільнай абілітацыі, якая прадугледжвае выезды да дзяцей, што жывуць па-за межамі сталіцы. Прыкладны радыус — 150 кіламетраў. На практыцы часам атрымліваецца значна больш.

— Працуем па запыце — выязджаем туды, дзе малому неабходна наша дапамога. Учора, напрыклад, наведваў дзіця ў вёсцы Грабянёва ў Аршанскім раёне, гэта больш за 200 кіламетраў у адзін бок. Спачатку аказваю дапамогу, кансультую і, калі бачу, што мая прысутнасць патрэбна ў далейшым, планую новыя візіты. Канешне, я мала часу праводжу дома, і для сям'і гэта мінус. Але плюс у тым, што адчуваю сябе запатрабаваным на рабоце і задаволены ёй.

Яшчэ адна праграма — камандная абілітацыя — прадугледжвае выезды некалькіх спецыялістаў у іншыя гарады на тыдзень. Паездкі па ўсёй Беларусі, у апошні месяц супрацоўнікі хоспіса пабывалі ў Магілёве і Мсціславе. У першы дзень наведвання фізічныя тэрапеўты і псіхолагі праводзяць навучальныя семінары з бацькамі асаблівых дзяцей і спецыялістамі. У астатнія дні — практычная работа з дзецьмі паліятыўнай групы.

Работа ў паліятыве патрабуе пастаяннага навучання — стажыруюцца супрацоўнікі хоспіса ў Італіі, Польшчы, Вялікабрытаніі. Зараз Юрый вучыцца на двухгадовых курсах Бобат-тэрапіі ў Маскве.

— У аснове работы фізічнага тэрапеўта ў хоспісе ляжыць якраз Бобат-тэрапія. Там, дарэчы, нас вучаць правільна ставіць мэту ў рабоце з кожным дзіцем. Калі яна дасягальная, тады будзе вынік.

ПРА ВЫНІКІ

Практычна кожнае дзіця, з якім працуюць спецыялісты хоспіса, развіваецца і робіць крокі наперад. Праўда, для гэтага павінны прыкладаць намаганні і бацькі, на якіх кладзецца асноўная нагрузка. Хоць для звычайных людзей часта такі прагрэс можа падацца нязначным, для самога дзіцяці і яго блізкіх — гэта неверагодныя намаганні і вялікі поспех.

— Уявіце малое з цяжкім захворваннем, якое прагрэсуе, — спінальнай мышачнай атрафіяй: дзіця знаходзіцца на апараце штучнай вентыляцыі лёгкіх, з трахеастомай, цалкам прыкавана да ложка і можа толькі паварушыць двума пальцамі. Увесь час яно ляжыць і глядзіць у столь. У працэсе работы мы знаходзім розныя позы, у якіх яно адчувае сябе добра: і фізіялагічна, і камфортна. Разам з бацькамі мы павярнулі яго на бок, падумалі як аблегчыць яму рух рукой — і дзіця паварушыла рукой, каб пагуляць! Гэта вялізны для яго крок, бо задзейнічана вялікая колькасць суставаў. І такіх прыкладаў шмат. Самае важнае — правільна паставіць мэту, над якой будзеш працаваць з дзіцем.

ПРА ДРЭННЫЯ НАВІНЫ І ПРАФЕСІЙНАЕ ВЫГАРАННЕ

— Працаваць з цяжка хворымі дзецьмі кожны дзень — гэта нескладана, — упэўнены Юрый. — Негатыў — гэта адсутнасць разумення ў нашым грамадстве, што такое паліятыў. Часам даводзіцца чуць, што няма сэнсу працаваць з такімі дзецьмі. На мой погляд, кожны чалавек, жывучы ў грамадстве, павінен адчуваць абароненасць. Любы з нас раптоўна можа трапіць у паліятыўную групу — ісці праз дарогу, папасці пад аўтамабіль і назаўсёды застацца ляжачым хворым. Таму нельга пакідаць сам-насам бацькоў дзяцей, якія не маюць так званага рэабілітацыйнага патэнцыялу.

— Здараецца, хтосьці з выхаванцаў памірае...

— Дыягназы ў нашых дзяцей такія, што яны могуць сысці ў любы момант. Смерць — гэта заўсёды цяжка. Але працуючы ў паліятыве, штодзённа назіраем вынікі сваёй дапамогі. Я бачу дзіця, якое есць праз гастрастому, яму спастычнасць не дазваляе прыняць нейкую позу, за яго дыхае апарат... Але яно ўсміхаецца, бо я нешта памяняў, навучыў бацькоў, і я бачу, што яму добра. Вось гэта пераважае любы негатыў. З дыягназам «хранічная ныркавая недастатковасць» можна пражыць некалькі дзесяцігоддзяў, і ўсе мы робім так, каб дзіця ўдзельнічала ў жыцці, а не было назіральнікам. Многія лічаць, што хоспіс — гэта месца, дзе людзі паміраюць. На самай справе хоспіс — гэта месца, дзе людзі пачынаюць жыць лепш.

Вельмі часта выхаванцы хоспіса здзіўляюць сваіх куратараў. Гэта заўсёды ўзнімае настрой. І з'яўляецца добрай прафілактыкай прафесійнага выгарання.

— Дзеці развіваюцца, якая б хвароба ў іх ні была. Многае залежыць ад бацькоў і ад нас, у які бок памяняецца дзіця. Яно можа памяняцца і ў горшы бок, з'явіцца другасныя ўскладненні. Але калі мы разам з бацькамі працуем, стан мяняецца да лепшага. Часам здараюцца настолькі рэзкія перамены, што немагчыма не здзівіцца. Дзіця, якое не магло сядзець без поўнай падтрымкі, праз нейкі час самастойна сядзіць! Гэта той выпадак, калі яно перасягае пастаўленую табой мэту. Але мы, безумоўна, улічваем, што дыягназы складаныя, і ніколі не чакаем, што дзіця яе перасягне. Часта нават захаваць яго на пэўным узроўні — ужо дасягненне. Хвароба можа прагрэсаваць, і стан будзе пагаршацца. Яшчэ нядаўна дзіця магло сядзець, а зараз не можа. Але давайце зробім так, каб яно было шчаслівым лежачы.

***P. S.** Ужо 25 гадоў Беларускі дзіцячы хоспіс дапамагае цяжкахворым дзецям бясплатна, існуючы толькі на ахвяраванні.*

Алена КРАВЕЦ.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

КАРАЦЬ НЕЛЬГА ДАПАМАГАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Я проста разрываўся паміж работай і домам, а дзеці плакалі! Мне здавалася, што яны ўвесь час плачуць». Потым бацькі заўважылі, што Саша стаў сінець. Аказалася, у малога сардэчная недастатковасць. Была патрэбна аперацыя. Нервы, хваляванні, рэабілітацыя... Перамаглі. Дзеці раслі, надышоў час ісці ў садок. І тут пачаліся праблемы ўжо іншага роду.

«Нас пастаянна выклікалі ў яслі: то малыя кагосьці паб'юць, то цацкі забяруць, то нешта разаб'юць, то істэрыкі ўчыняюць... Узнікалі праблемы і з бацькамі іншых дзяцей, і з выхавальнікамі. Гэта такі ціск, калі ўсе незадаволены тваімі дзецьмі. Ды і дома з імі не заўсёды ўдавалася справіцца. Паспрабавалі перавесці ў іншы садок... І там узніклі тыя ж самыя праблемы. Спецыялісты прапанавалі нам аддаць дзяцей у карэкцыйную ўстанову. Так было афіцыйна прызнана, што ў іх ёсць асаблівасці ў развіцці. Але мы ўсё ж спадзяваліся, што малыя перарастуць. На жаль, цуду не здарылася...»

«Каб аформіць дэкрэтны на бацьку, патрэбна заключэнне УКК, што маці не можа выконваць свае абавязкі. Аднак заключэнне немагчыма атрымаць, пакуль чацвёртае дзіця не адбяруць з сям'і! Але навошта ім заключэнне пасля адабрання дзіцяці?»

Калі надышоў час ісці ў школу, іх накіравалі адразу ў дапаможную, для дзяцей з асаблівасцямі ў развіцці. Кірылу і Сашу далі інваліднасць. У хуткім часе ў сям'і нарадзіўся трэці хлопчык Максім. Ён быў здаровы і развіваўся згодна са сваім узростам.

«Разумееце, мы гадавалі сваіх дзетак як умелі. Лічу, што ў малых было ўсё неабходнае: адзенне, ежа, кнігі, цацкі... У той дзень я быў вельмі стомлены. У дзяцей здарылася чарговая істэрыка. Я не ведаў, што рабіць... Сарваўся... Прызнаю сваю віну, паступіў непедагагічна — адлупцаваў іх. Разумею, што нельга прымяняць фізічнае пакаранне для малых. Зараз дзякуючы нашым органам апекі скончылі з жонкай некалькі курсаў па выхаванні дзяцей. Але тады здарылася

Алена КАШЫНА дапамагае сем'ям, якія аказаліся ў крызісным становішчы.

ўсё хутка: прыехала міліцыя і дзяцей адабралі. На камісіі высветлілі, што мая жонка мае дыягназ «лёгкая разумовая адсталасць». І ўсё. Аказалася, яна не можа выхоўваць дзетак паводле дыягназу, а я... Мяне пазбавілі бацькоўскіх правоў. Як жа так? Мы дзесяць гадоў выхоўвалі нашых дзетак, і ўсё было нармальна. А тут раз... І наша кватэра пустая».

Старэйшых дзяцей накіравалі ў дапаможную школу-інтэрнат, а малога забрала свячка пад апеку... Наташа ў той час не працавала. У Аляксандра сталі вылічваць грошы на дзяцей у памеры 70 працэнтаў ад заробку. Жыве сям'я ў Оршы, дзе зарплаты невялікія. У выніку пасля аплаты камунальных паслуг на жыццё не заставалася грошай... Па сутнасці, карміла іх бабуля за сваю невялікую пенсію. Так і жылі, пакуль знаёмыя не падказалі звярнуцца да Алены Кашынай. Гэта жанчына валанцёрыць: дапамагае сем'ям, якія аказаліся ў крызісным становішчы, мае юрыдычную адукацыю, раней працавала прыёмнай мамай, а зараз — апякун.

«Сям'я была проста ў адчаі, — расказвае Алена. — Яны пакутавалі ад разлукі са сваімі дзецьмі і, па сутнасці, галадалі. Я была настолькі ўражана

Аляксандр і Наталля.

іх расказам, што адразу кінулася ім дапамагаць. Разумееце, аддзел адукацыі зрабіў быццам бы ўсё правільна. Але ніхто не ўлічваў асаблівасці сям'і. У гэтых людзей проста не хапае кампетэнцый, каб нават паспрабаваць паменшыць памер адлічэнняў і не вісець на шыі ў бабулі...»

Праз некаторы час яны здолелі дабіцца змяншэння адлічэнняў на дзяцей. Дамагліся, каб бабулі Наталлі далі пад апеку старэйшых хлопцаў. Наталля аформілася даглядаць уласных дзяцей і атрымлівала дапамогу ад дзяржавы. Кожны дзень ходзіць да сваёй бабулі дапамагаць выхоўваць малых. Аляксандр не пакідаў спробы аднавіцца ў бацькоўскіх правах і вярнуць усіх дзяцей у сям'ю. У хуткім часе ў Наталлі нарадзілася дачка Ангеліна, і жанчына пайшла ў дэкрэт. Муж разумее, што жонка мае пэўныя абмежаванні і ёй патрэбна дапамога. Больш за тое, Наталля працягвае хадзіць дапамагаць сваёй бабулі, але ўжо з немаўляткам на руках. Бацька ж увесь дзень на працы і часта наведвае сацыяльны прытулак, каб пад наглядам спецыялістаў размаўляць па скайпе са сваім трэцім сынам, якога апекуны павезлі з сабой у Расію. Па законе зносіны павінны быць зафіксаваны, гэта адна з умоў вяртання дзяцей дамоў.

«Мы паспрабавалі аформіць дэкрэтны водпуск на мужа, бо ў Наталлі ж дыягназ і яна быццам бы не можа выхоўваць дачку, — разважае Алена Кашына. — Але ж у нас не атрымалася. Каб аформіць дэкрэтны на бацьку, патрэбна заключэнне УКК, што маці не можа выконваць свае абавязкі. Аднак заключэнне немагчыма атрымаць, пакуль чацвёртае дзіця не адбяруць з сям'і! Але навошта ім заключэнне пасля адабрання дзіцяці? Тады мужу ўжо і дэкрэтны будзе непатрэбны! Яму патрэбен водпуск, каб даглядаць дзіця і дапамагаць жонцы».

Усё ж вырашылі і гэту праблему. Аформілі Наталлю як рамесніка, і тады Аляксандр атрымаў дэкрэтны водпуск. Такім чынам дапамагалі адно аднаму, разрываючыся паміж домам, дзецьмі, якія выхоўваюцца бабуляй, і сацыяльным прытулкам. Але ўзнікае пытанне: чаму людзі павінны шукаць нейкія шчыліны ў заканадаўстве, каб проста зберагчы сваю сям'ю?

«Канешне, складанасці ў гэтай сям'і ёсць, — кажа Алена.— Але я катэгарычна не згодна з тымі, хто заяўляе, што такім людзям нельга нараджаць і стварацца сем'і. Права стварацца сям'ю і жыць разам са сваімі дзецьмі павінна быць ва ўсіх. Так, яны адрозніваюцца ад іншых, але гэта не дазваляе іншым вызначаць жыццё такіх сем'яў. Сёння ж нікога ўжо не абураюць пандусы. Усе нармальна ставяцца да людзей з інваліднасцю... Разумеюць, што для іх трэба крыху змяніць нашае асяроддзе, і яны змогуць нармальна жыць побач з моцнымі і здаровымі людзьмі. Па сутнасці, такім сем'ям, дзе бацькі маюць пэўны дыягназ, патрэбен той жа «пандус».

Думаецца, надышоў час стварыць нейкую сістэму, якая б забяспечвала суправаджэнне такіх сем'яў. Ну і сапраўды: залежных наведваюць цэлымі камісіямі, і калі патрэбна прывесці чалавека на працу, нават з міліцыяй прывядуць! Да тых жа матуль, у якіх нарадзіліся двайняты, і пажылых людзей прыходзяць дапамагаць сацыяльныя работнікі. А людзі з дыягназам, якія не ўпісваюцца ў гэту сістэму, аказваюцца сам-насам са сваёй бядой. Адны сустракаюць дзяцей і пакутуюць, іншыя шукаюць дапамогу, спадзеючыся на міласць тых, хто побач. Так, напрыклад, сям'я Ігара з Маладзечна доўга дабівалася дапамогі. Ігар са сваёй жонкай сляпыя. У іх нарадзілася двое дзетак. З кожным годам бацькам станавілася цяжэй выхоўваць малых. Што рабіць? Аддаць дзяцей у дзіцячы дом? Сярод блізкіх сяброў сям'і быў чалавек, які дапамагаў ім час ад часу. Ён і пагадзіўся жыць побач. Але як аформіць сваіх дзяцей пад апеку гэтаму чалавеку? Яны накіраваліся ў аддзел адукацыі і прызналіся, што самі ўжо не спраўляюцца. Іх дзецям патрэбен апякун, які будзе дапамагаць з выхаваннем. «Справа ў тым, што мы не хочам нікуды аддаваць нашых малых, — тлумачыць Ігар. — Але каб ім назначылі апекуна, зноў жа патрэбна атрымаць заключэнне УКК, а каб атрымаць гэтае заключэнне, нам трэба зрабіць так, каб нашы дзеці аказаліся ў небяспечным становішчы! Мы не хочам, каб нас каралі за тое, што мы НЕ МОЖАМ даглядаць дзяцей як здаровыя людзі... Нам проста патрэбна дапамога». Хочацца адзначыць,што дзяржаўныя органы звычайна ідуць насустрач такім сем'ям. Але не кожнай сям'і шанцуе сустрэць на сваім жыццёвым шляху чалавека з вялікім сэрцам. І тады сем'і з апошніх сіл выкручваюцца, прыдумляюць розныя «схемы», каб быць побач са сваімі дзеткамі. А тыя, хто не здолеў знайсці выйсце, пакутуюць ад разлукі. Па сутнасці, пакутуюць праз тое, што ў іх ёсць дыягназ.

Напрыклад, тыя ж Аляксандр і Наталля — уразлівая сям'я. У Наталлі лёгкая ступень разумовай адсталасці. Калі сям'я жыла разам з бабуляй, у іх было пэўнае суправаджэнне ад роднага чалавека. Дзеці раслі, а бабуля дапамагала Наталлі. Як толькі яны пераехалі ў сваю кватэру, хутка страцілі дзяцей. Ва ўпраўленні па адукацыі Аршанскага раёна, куды мы звярнуліся па каментарый на конт гэтай сітуацыі, сказалі: «Задача органаў апекі — здзяйсняць абарону правоў і законных інтарэсаў дзяцей, чые бацькі не выконваюць ці неналежным чынам выконваюцьускладзеныя на іх абавязкі па выхаванні і ўтрыманні дзяцей».

«Мы не хочам, каб нас каралі за тое, што мы НЕ МОЖАМ даглядаць дзяцей як здаровыя людзі... Нам проста патрэбна дапамога».

Наталля і Аляксандр і рады былі б выконваць свае абавязкі належным чынам, але не хапае ў іх для гэтага кампетэнцый. З боку спецыялістаў з сям'ёй усё ж праводзілася праца згодна з заканадаўствам: «Органы апекі не толькі кантралююць, але і аказваюць дзейсную падтрымку і дапамогу такім сем'ям: псіхолага-педагагічную, прававую, матэрыяльную, садзейнічаюць у працаўладкаванні бацькоў, каб дзяцей не прыйшлося разлучаць з імі», — гаворыцца ў каментарыі. Але здаецца, сям'я мае патрэбу не ў часовым, а ў рэгулярным суправаджэнні. Дзеці растуць, і іх патрэбы таксама мяняюцца. Наталля і Аляксандр любяць сваіх малых і гатовы іх выхоўваць, але ім патрэбны чалавек, які проста ў пэўны момант падкажа, што рабіць, не чакаючы крызіснага стану, калі дзяцей ужо трэба забіраць. Калі б сям'ю наведваў спецыяліст, які б мог падказаць бацькам, як сябе паводзіць падчас істэрыкі ў дарослых дзяцей, як прывучыць малую да гаршка, як правільна гатаваць ежу для першага прыкорму і да т. п., то, магчыма, сям'я сёння не пакутавала б ад расставання. Спецыяліст абыдзецца дзяржаве значна танней, чым утрыманне трох дзяцей у дзяржаўнай установе. А малыя будуць расці ў сваёй сям'і і не атрымаюць адну з самых цяжкіх дзіцячых траўмаў — наступствы ад страты сваіх родных.

Тым больш у нашай краіне ёсць досвед вырашэння такіх праблем. Так, у 90-я гады ў нас не праводзілі работу з бацькамі, у якіх ёсць залежнасць. Звычайна дзеці траплялі ў дзяржаўную ўстанову, калі ў сям'і ўжо здаралася трагедыя ці малыя заставаліся ўвогуле без нагляду дарослых. Дзеці пасля адабрання з сям'і маглі месяцамі ляжаць у бальніцах, пакуль афармляліся дакументы. Сёння выпрацавана сістэма дапамогі такім сем'ям. З залежнымі праводзіцца сур'ёзная работа: іх уладкоўваюць на працу і лечаць. Органы аховы і правапарадку наведваюць іх дома, праводзяць з імі прафілактычныя гутаркі. Дзеці падчас прафілактычнай працы з бацькамі жывуць у спецыяльна створаных сацыяльных прытулках. Здаецца, надышоў час звярнуць увагу і на сем'і, у якіх ёсць пэўныя асаблівасці і патрэбнасці.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

❍ Кампетэнтна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры і навуцы Ірына РЫНЕЙСКАЯ:

— Права мець і выхоўваць сваё дзіця ёсць у любой сям'і, у тым ліку і ў сем'яў, дзе бацькі маюць інваліднасць ці іншыя захворванні. Адзначу, што ў нашай краіне ўмовы падтрымкі такіх сем'яў усё больш удасканальваюцца. Як прыклад, не так даўно ўведзена сацыяльная паслуга няні, якая аказвае дапамогу па доглядзе дзіцяці сем'ям, у якіх бацькі з'яўляюцца інвалідамі першай ці другой групы.

Безумоўна, праца ў гэтым кірунку павінна весціся і далей у рэчышчы міжведамаснага ўзаемадзеяння: органаў аховы здароўя, адукацыі, сацыяльнай абароны, дэпутацкага корпуса і грамадскіх арганізацый. У сістэме падтрымкі такіх сем'яў важныя два ключавыя моманты — здароўе і бяспека дзіцяці і гатоўнасць і здольнасць бацькоў яго выхоўваць.

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**.

Продавец: ОАО «Агрокомбинат «Приднепровский» (УНП 700018291) в лице антикризисного управляющего Волчка В. И.

Третьи повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **22 апреля 2019 г.** 09.00–17.00 на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Республика» от 22.02.2019 г.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. с НДС
1	Автомобиль грузовой специальный цистерна ZIL-130, 1988 г. в., кузов № 2748810	2 240,00
2	Трактор МоАЗ 49011, 2008 г. в., зав. № 40000051	7 280,00
3	Трактор Беларус-892, 1999 г. в., зав. № 08019479	6 500,00
4	Комбайн зерноуборочный самоходный КЗС-1218-10 «ПАЛЕССЕ», 2008 г. в., гос. № ТВ-6 3072	12 780,00
5	Экскаватор ЭО2621, 1984 г. в., гос. № 8705 МД	2 100,00
6	Капитальное строение с инв. № 700/С-103892, Могилевский р-н, Кадинский с/с, 24/2. здание инв. № 814, севернее аг. Романовичи, площадь – 1255.0 кв. м, назначение – здание специализированное животноводства, включая мебель; капитальное строение с инв. № 700/С-103894, Могилевский р-н, Кадинский с/с, 24. здание инв. № 683, севернее аг. Романовичи, площадь – 924.1 кв.м, назначение – здание специализированное животноводства, включая мебель; капитальное строение с инв. № 700/С-103893, Могилевский р-н, Кадинский с/с, 24/1. здание инв. № 684, севернее аг. Романовичи, площадь – 1031.0 кв. м, назначение – здание специализированное животноводства, включая мебель	140 000,00
7	Капитальное строение с инв. № 700/С-104270, Могилевский р-н, Р-122, 15-й км, 1, площадь – 2361.2 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – страусиное ранчо, Емкость 38 куб. м (закопана на страус.ранчо под канализацию), 1шт., 2009 г. в., инв. № 2677	254 880,00

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 03, Игорь.

Для участия в торгах необходимо в срок по 19.04.2019 г. 17.00: 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее - в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Оформление результатов торгов в день их проведения.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а так же аукционный сбор. После этого, между продавцом и победителем торгов в течение десяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27., тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**

Продавец: ОАО «Рапс» (УНП 600068480) Минский р-н, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, тел. 8017 506-91-51. Публичные торги в электронной форме будут проведены: **13 мая 2019 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. с НДС
1	Комбайн зерноуборочный самоходный КЗС-1218-10 «Палессе GS12», зав. № 1594, 2009 г. в. с жаткой	31 920,00
2	Комбайн зерноуборочный самоходный КЗС-1218-03 «Палессе GS12», зав. № 01875, 2010 г. в. с жаткой	43 680,00
Местонахождение – Минский р-н, аг. Крупица, междвор ОАО «Рапс», тел. для осмотра +375 29 113-79-43		

Для участия в торгах необходимо в срок по 11.05.2019 г. 17.00: 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) далее подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **WWW.BELTORGI.BY**; 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте **WWW.BELTORGI.BY**).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи.

Прачытаў — перадай другому: *сумесны праект газеты «Звязда» і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

«Пакуль людзей забівалі, аркестр выконваў фашысцкія маршы»

Пра якія злачынствы фашыстаў сведчаць партызанскія газеты

«...Па пажарышчах адзінока бадзяюцца пагарэльцы. Каля абломкаў печы маці і чацвёра дзяцей пякуць бульбу. Два старыя недзе дасталі абгарэлыя дошкі і робяць труну для свайго суседа, цела якога яшчэ ляжыць на месцы гібелі — у кустах каля рэчкі, дзе стары хаваўся ад самалётаў. Асколкам бомбы знесла яму чэрап... Па вуліцы бяжыць, захлёбваючыся плачам, звар'яцелая жанчына сярэдніх гадоў. Падчас бамбардзіроўкі яна згубіла сваю пяцігадовую дачушку і зараз не можа яе знайсці.
А над суседняй вёскай кружыцца згрыза чорных фашысцкіх сцярвятнікаў, густа кідаючы ўніз запальныя бутэлькі і бомбы... І так кожны дзень. У Ветрынскім раёне фашысцкай авіяцыяй спалена за апошні час больш за 50 вёсак...» Гэтыя радкі — з «Чырвонай звязды» за 30 кастрычніка 1943 года. Падпольныя і партызанскія газеты, якія выдаваліся на акупаванай тэрыторыі Беларусі, сведчаць пра масавыя забойствы мірных жыхароў. На іх старонках можна знайсці назвы спаленых вёсак, прозвішчы закатаваных людзей і жахлівыя аповеды пра злачынствы, што адбываліся на нашай зямлі.

Тактыка выпаленай зямлі

Непамерныя падаткі, якімі спачатку нямецкая акупацыйная ўлада абкладала насельніцтва, у 1943 годзе змяніліся сапраўдным рабаваннем: у сялян забіралі скаціну, прадукты, рэчы. У Мінскай, Гомельскай, Палескай, Магілёўскай абласцях спецыяльныя брыгады, створаныя акупантамі, адбіралі хлеб проста з палёў. Каб асудзіць насельніцтва на голад, у жніўні 1943 года немцы знішчалі палеткі, забаранялі пад страхам пакарання збіраць ураджай. Так, дзевяць фашысцкіх сцярвятнікаў наляцелі на палеткі вёсак Зелянковічы і Зубарэвічы. Самалёты абстрэльвалі з кулямётаў людзей, што працавалі на полі, кідалі бомбы і запальныя шашкі ў стагі і копы.

«Прайдзіце па вёсках Гаравыя, Лазовікі, Зарэчча — і вы ўбачыце выбітыя шыбы, паламаныя рамы, ушчэнт разбітыя дзверы...

Так выглядае кожная наша хата. Усё, што ў ёй было з гаспадарчых рэчаў — самавары, сталовыя лыжкі і відэльцы, аконныя завесы і ручкі, — забрана, відаць, на ваенныя справы. Астатняе — бязлітасна знішчалася. Лапці і тыя рваліся на кавалкі. Падвергліся вобыску нават смеццевыя ямы і прыбіральні», — скардзіліся сяляне партызанам, іх ліст друкуецца ў кастрычніку 1943 года ў «Чырвонай звяздзе».

Але самае страшнае, калі за рабаваннем ішлі масавыя расправы над жыхарамі — жывымі спальвалі сотні людзей, нікому не давалі шанцаў выжыць.

У газеце «Большэвіцкая трыбуна» (орган Барысаўскага гаркама і райкама КП(б) Б)) за 15 красавіка 1943 года знаходжу артыкул пра трагедыю ў Хатыні: «22 сакавіка фашысцкае звяр'ё ўварвалася ў вёску Хатынь Каменскага сельсавета Плешчаніцкага раёна. Усіх жыхароў вёскі яны сагналі ў два хлявы, насупраць дзвярэй хлявоў паставілі кулямёты. Хлявы абклалі саломай і запалілі. Калі палаючыя дахі пачалі абвальвацца на жанчын, старых і дзяцей, яны сталі выбягаць з хлявоў, а фашысты расстрэльвалі іх з кулямётаў. Усяго загінула ў агні і было расстраляна 304 чалавекі, паранена 9 чалавек. Усе дамы і халодныя пабудовы вёскі спалены». Таксама газета расказвае пра іншыя вёскі, якія былі знішчаны фашыстамі ў гэты час, — Богуты, Ляды, Прылепы, Пагарэльцы...

Пра вясковыя трагедыі ў газеты пісалі вяскоўцы, якім удалося ацалець, ці партызаны, якія пасля пагромаў прабіраліся на месцы трагедыі. Сведкі апісваюць жахлівыя падзеі, называюць прозвішчы ахвяр, — сярод якіх цяжарныя жанчыны, немаўляты, старыя. «Мы, сяляне вёсак Заполле, Камаровічы, Боркі, Фаставічы, праз газету «Звязда» хочам расказаць усім працоўным аб тых жудасных і крывавых злачынствах, якія ўчынілі гітлераўцы ў нашых вёсках у сакавіку месяцы 1943 года.

Раніцай, як зграя дзікіх звяроў, наляцелі гітлераўскія бандыты на вёску Заполле. На гэты раз яны не страляліс аўтаматаў і кулямётаў, а з нажамі ў руках урываліся ў хаты і выразалі адну сям'ю за другой. Ні малым, ні старым, ні хворым не давалі літасці. Выразалі ўсіх пагалоўна.

Ад крывавых рук гітлераўскіх людаедаў загінулі Ева Талецкая і Ганна Карнейчык з малымі дзецьмі. Стасю Трухановіч і трое яе дзяцей яны закалолі штыкамі. Нямецкія душагубы запалілі вёску. А потым лавілі яшчэ застаўшыхся старыкоў, жанчын, дзяцей і кідалі жывымі ў агонь...»

31 жніўня 1943 года «Чырвоная звязда» друкуе ліст партызанаў, якія абяцаюць адпомсціць ворагу за гібель ні ў чым не вінаватых людзей: «Нядаўна фашысцкія зверы спалілі зажыва ў вёсцы Гурц 60-гадовую Данішэўскую Вікторыю. 38-гадовай Цюлькевіч Еве гітлераўскія людаеды адрубілі рукі і ногі, а пасля жалезным крукам зачапілі за падбародак і павесілі. Яе 14-гадовую дачку Ядзю таксама павесілі. Такіх фактаў фашысцкіх звярстваў можна прывесці дзясяткі...»

Вяскоўцаў закопвалі паўжывымі ў зямлю, заганялі на мінныя палі, закідвалі трупамі калодзежы, а часам кідалі туды і жывых. У вёсцы Вужынец Калінкавіцкага раёна немцы спалілі больш за сто двароў. 30 старых і дзяцей яны кінулі жывымі ў калодзеж і засыпалі зямлёй. У Хойніцкім раёне людзей секлі сякерамі, рэзалі і калолі кінжаламі....

Газеты сведчаць пра дзікія, вар'яцкія забойствы. «Нечуваным мукам падверглі нямецкія дзікуны 70-гадовую Сокал Ганну, грамадзянку вёскі Міхедавічы Петрыкаўскага раёна. Ёй злупілі з рук скуру, збілі ўвесь твар, а потым павесілі. 89-гадоваму Налецка Арцёму яны выкалалі вочы. Акуліч Агапу, 65 год, бандыты абклалі саломай і спалілі». «Гэта яны, фашысцкія канібалы, прывязалі да слупа і спалілі 80-гадовага дзеда Ціта Ушака ў Какуевічах. Гэта яны выкалалі вочы Маланні Ходзька ў Бабунічах. Гэта яны нацкавалі сабак на сялян вёскі Нязнанне, запраглі ў калёсы нашых людзей у Зарэчцы», — расказваў у жніўні 1943-га «Большэвік Палесся», ён жа напісаў пра трагічную смерць калгасніцы Гэлі Царык з вёскі Макраны Глускага раёна. Змучаную і збітую прыкладамі жанчыну заперлі з грудным дзіцем у хаце, напоўненай саломай і падпалілі. А калі яна з немаўляткам выскачыла з палаючай хаты ў акно, злавілі, звязалі разам з дзіцем вяроўкамі і кінулі ў агонь.

На расправу выпраўлялі не толькі нямецкія гарнізоны, вёскі бамбілі з самалётаў. «Чорныя трубы, як помнікі вялікіх злачынстваў гітлераўскіх мярзотнікаў, радамі высяцца на месцах квітнеючых беларускіх сёл і вёсак. Іх дзясяткі і сотні, гэтых мірных паселішчаў, ад якіх засталіся толькі назвы. Гэты жудасны малюнак можна назіраць у Сенненскім, Талачынскім, Бешанковіцкім, Чашніцкім, Лепельскім і другіх раёнах Беларусі. На вуліцах і агародах злавесна зіяюць вялікія варонкі. Гэта вылюдак Гітлер супраць старых, жанчын і дзяцей пасылае бамбардзіроўшчыкі, якія загружаны запальнымі сумесямі і фугасамі бомбамі... Вось Рыдомльская воласць Талачынскага раёна. У ёй уцалелі пакуль толькі дзве вёскі, усе астатнія спалены. У Рыдомлі гітлераўскія паплечы з абыякавасцю прафесійных забойцаў разарвалі дзясяткі людзей, кідалі ў полымя, у калодзежы старых і дзяцей. Зусім нядаўна, у лістападзе, гітлераўскія гады спалілі адзінаццаць вёсак Сенненскага раёна — Алексінічы, Зяньковічы, Шынкова, Барок, Леснікова, Казадой, Ляўкова, Рай, Вялікае Сяло, Жохава, Лугі. Усяго згарэла 578 дамоў... У другіх вёсках гітлераўскія разбойнікі на самалётах ганяліся за жанчынамі і дзецьмі, якія ўцякалі з палаючых хат, асыпалі градам куль («Чырвоны хлебароб», 5 снежня 1943 года).

Некаторым вяскоўцам давялося пражыць не адну расправу. Людзі

«Большэвік Палесся» расказвае пра жудасныя забойствы.

«Большэвіцкі сцяг». Нумар за 14 ліпеня 1943 года апісвае, што сталася з гарадскім пасёлкам Рудзенск.

«Чырвоны хлебароб». Партызаны клянуцца адпомсціць за спаленыя вёскі.

са спаленых вёсак хаваліся ў балотах і лясах, туліліся ў наспех вырытых зямлянках, але і там да іх дабіраліся фашысты падчас карных аперацый. «Ратуючыся ад расстрэлаў і ўгону ў Германію звыш 10 000 мірных грамадзян хаваліся ў Шчаглоўскім лесе. Немцы абкружылі лясны масіў, на працягу некалькіх дзён абстрэльвалі яго з артылерыі і мінамётаў, а затым бамбардзіравалі. Гітлераўцы забілі за гэты час, па далёка не поўных даных, звыш 2000 мірных жанчын старых і дзяцей», — паведамляў «Чырвоны хлебароб» 18 сакавіка 1943 года.

У фашысцкай няволі

Бывала, частку людзей у вёсцы спальвалі, а працаздольнае насельніцтва вывозілі. Вайна, якая зацягнулася, выклікала ў Германіі востры дэфіцыт рабочых рук. Праблема вырашалася за кошт захопленых тэрыторый. З Беларусі было вывезена каля 400 тысяч чалавек. Часта нявольнікі гінулі ў дарозе ад голаду, хвароб і нямецкіх куль.

«Было гэта восенню 1942 года. Вёску Аляксандраўка Ельскага раёна акружылі з усіх бакоў гітлераўцы. Закрыўшы ўсе выхады з вёскі, яны сілком сабралі ўсю моладзь і, як жывёлу, пагналі ў Ельск. А там, у хлявах і абгароджаных калючым дротам кашарах, пад узмоцненай аховай жандармаў і паліцэйскіх, ужо знаходзіліся сотні юнакоў і дзяўчат, якія прайшлі «камісію» альбо чакалі сваёй чаргі.

Так праходзіла чарговая адпраўка нявольнікаў у Германію. Толькі з ад-наго Ельскага раёна было загнана ў фашысцкае рабства больш 3000 чалавек», — пісаў «Большэвік Палесся» ў сакавіку 1943 года. На акупаванай тэрыторыі вялася прапаганда, каб завабіць моладзь на працу ў Германію. А партызанскія і падпольныя друкарні праз газеты і ўлёткі паказвалі, што насамрэч чакае хлопцаў і дзяўчат у Нямеччыне. У тым ліку яны друкавалі і лісты остарбайтараў.

«Хлебоўскага я даўно ўжо не бачыла, затое Буракоўскага бачу кожны дзень. Жыву добра, як дзядзька Зміцер, што на канцы сяла...» — такі ліст быў атрыманы з Германіі ў вёсцы М. Бацькі адразу разгадалі, што дачка галадае, замест хлеба яе кормяць бураками, а дзядзька Зміцер — жабрак, вядомы ва ўсіх навакольных вёсках.

«Большасць маіх сябровак выйшла замуж за англійскіх лётчыкаў. Я напішла сабе сукенку з адным рукавом. Мабыць, таксама выйду за лётчыка...» І тут разгадка была хуткай. Часта нявольнікаў адпраўлялі працаваць на нямецкія ваенныя заводы, якія бамбілі саюзнікі. Многія работнікі загінулі ў выніку англійскіх бамбардзіровак. А аўтарка ліста, відаць, засталася без рукі і чакае сваёй гібелі...

Бясплатная рабочая сіла выкарыстоўвалася і непасрэдна на захопленай тэрыторыі. «Васілевіцкі торфазавод немцы ператварылі ў нявольнічы лагер. Зараз там тамяцца ў страшэнных пакутах 450 савецкіх грамадзян, з іх 230 падлеткаў ва ўзросце ад 12 да 14 гадоў.

Ад цямна да цямна працуюць нявольнікі, атрымліваючы два разы ў дзень поліўку з бураковага бацвіння. За малейшую дробязь немцы б'юць совецкіх людзей шампаламі, прыводзячы іх да беспрытомнасці. Ад пабояў і непасільнай працы многія сталі інвалідамі. У лагеры шырока распаўсюджаны эпідэмічныя захворванні», — пісаў «Большэвік Палесся» ў жніўні 1943 года.

«Новы парадак»

